СЁНЬНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА ГЕНЭР ПАДРЫХТАВАНА

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 90 (3994)
ЧАЦЬВЕР, 2 КРАСАВІКА
1931 г.
Гэта нумара 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАРЫЎНА

Тэрор, манэўры і ваенныя авантуры

Асаблівасьць сучаснага міжнароднага становішча заключаецца ў тым, што капіталістычны сьвет, які ўсё больш падгніває і разьдзіраецца ўнутранай барацьбой за новы перадзел сьвету, можа патрабаваць за кошт СССР вырашыць ня толькі труднасьці гаспадарчага крызісу, але і свае ўласныя супярэчнасьці і жорсткую канкурэнцыйную барацьбу. Іменна ў сьвятле гэтага становішча трэба ўзяць і кампанію супроць «савецкага дэмпінгу» і кампанію з повазу «прымусовай працы» і ўсё больш трывожныя галасы буржуазнай прэсы аб нашай пяцігодцы, аб узрастаючай магутнасьці Савецкага Саюзу. Францускі імпэрыялізм усімі сіламі прабуе згуртаваць адзіны антысавецкі фронт, ідучы на чале ўсякай антысавецкай кампаніі, выступаючы ініцыятарам усяких антысавецкіх мерапрыемстваў.

Польшча фашысцкай дыктатуры ў гэтай антысавецкай шуміце, якая зноў важывілася, адыгрывае адну З ПЕРШЫХ РОЛЯЙ. Ваенныя настрої зноў узмацніліся з надыходам чарговай вясны. Старонні ўсёй польскай прэсы розных кірункаў і адценьняў перапоўнены артыкуламі аб пяцігодцы, аб яе дасягненьнях, аб тых небясьпеках, якія пагражаюць капіталістычнаму сьвету з боку мацнеючай краіны сацыялізму. Урадавыя колы Польшчы праяўляюць вялізарную нэрвовасьць з повазу кожнага пасьпяховага кроку замежнай палітыкі савецкага ўраду. Апошнія перагаворы ўраду СССР з нямецкімі прамысловцамі выклікалі пітаральны параксызм шаленства і азлобленага незадавальненьня з боку польскай афіцыёзнай прэсы. Гэта дзіўная нэрвовасьць з повазу паляпшэньня нямецка-савецкіх адносін зразумела, бо тэзіс паляпшэньне зьяўляецца бясспрэчным ударам па антысавецкім фронце ў Эўропе, бо яно ўзмацняе справу міру.

У адным з сваіх апошніх выступленьняў на пасяджэньні польскага сэйму польскі эндэцкі палітык Казіцкі адкрыта заявіў аб існуючых планах інтэрвэнцыі ў колах кіруючай буржуазіі Францыі і ў ліпсудчыкаўскіх колах Польшчы. Гэты сэнатар, якога мы ні ў якім выпадку не можам зэпалаўзіць у якіх-небудзь сымпатыях да СССР, гаворыць:

«Я пічу зусім рэальнай небясьпеку плянаў, накіраваных да таго, каб штурхнуць наш народ (гутарка ідзе аб Польшчы — Рэд.) на шматлікія па сваіх рэзультатах, катастрафічныя крокі... Гэтымі плянамі зьяўляецца думка аб зьнішчэньні новага жанчурэйта (гутарка ідзе аб СССР — Рэд.) шляхам палітычнай інтэрвэнцыі, скажам ясьней, інтэрвэнцыі ваеннай».

Буржуазны палітык, эндэцкі ворат СССР, паводле поўных тактычных меркаваньняў сваёй палітычнай партыі, адкрыта заяўляе аб тым, што пляны інтэрвэнцыі ня толькі існуюць, але што ажыцьцяўленьне іх зьяўляецца зусім рэальнай небясьпекай. І неабыдкова таму, што ў органе буйных лодзінскіх фабрыкантаў «Рэчпаспалітая», у сувязі з прыездам Пілсудзкага з высны Маёзры ў Польшчу, мы чытаем наступную паказальную заяву:

«Польшча і Эўропа знаходзяцца зараз у стане як-бы падрыхтоўкі да якогасьці новага пэрыяду, да новых гістарычных перажываньняў, можа быць вялікіх устрасеньняў...»

Зусім зразумела пра якія-сякія «устрасеньні» і «гістарычныя перажываньні» гаворыць гэта газэта. Гутарка ідзе аб ваенных авантурах, да якіх, зпамяўшы галаву, імкнецца польскі імпэрыялізм.

З відавочнай выразнасьцю выступаюць ваенныя авантурыстычныя пляны польскага ўраду ў галіне яго нацыянальнай палітыкі. Нам ужо на раз прыходзілася ўказваць, што карныя экспэдыцыі на Заходняй Украіне былі сваёасаблівай «рэпэтыцыяй» падрыхтаваньняў польскага фашызму да вайны супроць СССР, «рэпэтыцыяй», якая ідзе па лініі крывавага пагрому нацыянальна-вызваленчага руху украінскіх працоўных мас. Карныя экспэдыцыі з Заходняй Украіны перакідваюцца на Заходнюю Беларусь. Жорсткі тэрор акупантаў пануе як на акупаваных землях Зах. Беларусі, так і ў карэннай Польшчы. Усьлед за Луцкам пасьледавалі падобныя-ж крывавыя падзеі ў засьценках дэфэнзывы Ліды, Кобрыка і Баранавічаў. Палітыка тэрору ў адносінах да нацыянальна-вызваленчых арганізацый на Заходняй Беларусі непарыўна і непасрэдна зьвязана з палітыкай вайны.

За самы апошні час на З. Б. арыштаван тав. Тарашкевіч, ідучы арышты левых дзеячоў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. З падвоенным націскам аднавіліся атакі аб'яднаных сіл польскага фашызму і беларускага нацыянал-фашызму на Таварыства Беларускай Школы. Па ўсёй З. Б. ідзе хваля палітычных працэсаў (Слонім, Пружаны, Вільня і г. д.), якія заканчваюцца, як правіла, цяжкімі катаржнымі прыгаварамі над рабочымі і сялянамі З. Б. Найменшае праяўленьне барацьбы беларускіх працоўных мас за школу на роднай мове сустракае жорсткі адпор акупантаў. Ва ўсёй ЗБ няма ні адной легальнай газэты беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Унутры тюрмаў, у якіх сядзяць толькі на Зах. Беларусі каля дзьвюх з палавой тысяч палітзьняволеных, праводзіцца сыстэматычная ліквідацыя ўсіх праў заваяваных палітзьняволенымі ва ўлартай і цяжкой барацьбе з турэмнай адміністрацыяй. У Бепастоцкай, Віленскай, Гораздзенскай, Несьвіскай і інш. турмах праходзіць хваля галадовак і бунтаў, накіраваных супроць зьверскіх, нечалавечых умоў турэмнага рэжыму.

І побач з гэтым разьюшаным, нябачным на сваіх разьмерах і жорсткасьці тэрорам акупанты ўжываюць цэлы рад мер, якія ідуць па лініі розных палітычных канцэсіяў з заходня-беларускай і заходня-украінскай буржуазіяй і яе нацыянал-фашысцкімі партыямі і групоўкамі. Гэтыя канцэсіі маюць яўны антысавецкі ваенны характар. Тэрорам задушваючы рух мільённых мас, акупанты імкнуцца яшчэ больш узмацніць саюз з буржуазна-кулацкай верхавінай прыгнечаных народаў. Разам з беларускімі і украінскімі нацыянал-фашыстамі польскія акупанты вядуць сыстэматычнае цкаваньне БССР і УССР і ўзьнімаюць асабліва злоснае выцьцё ўсякі раз, калі тут пралетарская дыктатура б'е па контр-рэвалюцыянэрах, шкодніках і шпёнах.

Побач з перагворамі, якія вядуць прадстаўнікі польскіх фашыстаў з украінскімі буржуазнымі групоўкамі, за апошнія дні ў Вільні адбыўся рад сходаў, прысьвечаных так званым «польска-беларускім адносінам». На гэтых сходах прысутнічаюць выключна афіцыйныя прадстаўнікі польскага ўраду, як віленскі ваявода Кіртыкліс, генэрал Жэлігоўскі, выдатны чыноўнік міністэрства замежных спраў Тадэуш Галувко і інш. У ліку такіх сходаў была нарада ў віленскім «Клюбе Сполэчным» з дакладам Астроўскага, дзе ён разгарнуў праграму яўнага і адкрытага супрацоўніцтва польскага і беларускага фашызму і сумеснага цкаваньня БССР і барацьбы супроць нацыянал-вызваленчага руху заходня-беларускіх працоўных мас. Усьлед за гэтай нарадай адбылося пасяджэньне ўсіх фашысцкіх дэпутатаў сойму трох заходня-беларускіх ваяводзтваў, на якім зноў-такі абмяркоўваўся даклад Астроўскага і на якім выступаў на гэту тэму прадстаўнік польскага ўраду Тадэуш Галувка.

Для нас зусім ясна, што ўсе гэтыя пасяджэньні, нарады і г. д. прысьвечаны пытаньням узмацненьня белага тэрору на ЗБ, пытаньням далейшага ўзмацненьня цкаваньня БССР, пытаньням антысавецкай інтэрвэнцыі. Ломанага граша на варты ўсялякія пацыфісцкія запэўнываньні прадстаўнікоў польскага ўраду ў сьвятле гэтых антысавецкіх крокаў і мерапрыемстваў акупантаў.

Польскі фашызм, які задыхаецца ва ўмовах найглыбейшага крызісу, праўляе вялізарны непакой, калі гутарка ідзе аб працэсе над бандай контр-рэвалюцыйных беларускіх нацыянал-дэмакратаў, арыштаваных органамі пралетарскай дыктатуры ў БССР. Гэты непакой зьвязан з яўнай боязьню выкрыцьця ўсіх ваенных і антыінтэрвэнцыяністкіх плянаў польскага імпэрыялізму і таго антыўнага падтрыманьня, якое ён аказвае шкоднікам і контр-рэвалюцыйным нацыяналістам усіх масьцей унутры савецкай краіны. Разам з гэтым, акупанты з боязьні перад нарастаючай хваляй рэвалюцыйнага руху на самой Заходняй Беларусі, абвастраюць палітыку тэрору і прабуюць радам манэўраў, ашуканскіх і правацыцыйных крокаў, пры дапамозе і падтрыманьні беларускіх нацыянал-фашыстаў, разьбіць рады нацыянальна-вызваленчага руху.

Пляны фашысцкіх авантурыстаў, сэнс усіх іх манэўраў, мэты антысавецкага цкаваньня — зусім ясныя. Жорстка памыляюцца гэтыя авантурысты, калі яны думаюць сваімі ашуканскімі манэўрамі задушыць рух мас і дэзарганізаваць яго. Мільённыя масы працоўных Заходняй Беларусі, пад кіраўніцтвам сваёй камуністычнай партыі, не на жыцьцё, а на сьмерць вядуць барацьбу супроць акупацыі і супроць усіх яе агентаў, якую-б вопратку яны не апранулі. На тэрор акупантаў працоўныя ЗБ адкажуць узрастаючым адпорам і разгортваньнем фронту клясавай рэвалюцыйнай барацьбы. Лёзунгі абароны СССР, праўда ад сацыялістычным будаўніцтве БССР прасякае ў самыя глухія куткі Заходняй Беларусі і мабілізуе на барацьбу супроць ваенных імпэрыялістычных плянаў польскага імпэрыялізму новыя пласты працоўных мас.

Усякія авантуры польскіх фашыстаў, усё іх антысавецкае цкаваньне сустракаюць, як заўсёды, руйнуючы адпор з боку мільённых мас рабочае клясы і працоўнага сялянства Савецкай Беларусі. Ня трэба, панове, забываць тай «маленькай» розьніцы, якая існуе паміж становішчам Польшчы і Савецкага Саюзу. Там—крызіс. Там—мільён беспрацоўных. Там — абвостраная клясавая барацьба прапетарыяту Польшчы і прыгнечаных народаў. Там — прасякненьне рэвалюцыйных настрояў і ў асяродзьдзе польскай арміі. Тут, у нас — агульны ўздым узрастаючага сацыялістычнага будаўніцтва. Тут, у нас—адсутнасьць беспрацоўя. Тут, у нас—вялізарнейшы энтузіязм рабочае клясы, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, якія будуюць сацыялізм, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Тут, у нас—вырашаная нацыянальная праблема і вольнае эканамічнае і нацыянальна-культурнае разьвіцьцё вызваленых народаў СССР. І тут, у нас, нарэшце — узрастаючая магутнасьць Чырвонай арміі, якая апіраецца на непарыўную сувязь з мільёнамі працоўных СССР.

Няхай гэтага не забываюць польскія імпэрыялісты і іх нацыянал-фашысцкія агенты.

У адказ-жа на тэрор акупантаў мы успомнім словы т. Гея з яго прамовы на Ўсебеларускім зьезьдзе калгасьнікаў: «Ня можа быць сумненьня ў тым, што ўсе нашы сымпатыі будуць на баку рабочых і сялянскіх мас Зах. Беларусі, якія пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Зах. Беларусі і кампартыі Польшчы праводзяць упартую барацьбу з фашысцкім рэжымам».

Магутны пратэст супроць крывавых злачынстваў польскага фашызму на Зах. Беларусі пранясіцца шырокай хваляй на ўсёй БССР і пакажа яшчэ раз нашу гатоўнасьць да абароны нашай мірнай сацыялістычнай працы.

Прывітаньне тав. Сталіна работнікам Азнафты і Грознафты

МАСКВА, 31. Тав. СТАЛІН зьвярнуўся з наступным прывітаньнем да работнікаў Азнафты і Грознафты:

— Вітаю рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал Азнафты і Грознафты з выкананьнем пяцігодкі за 2½ гады. З перамогай, таварышы!

Няхай жывуць рабочыя СССР, якія разьбілі панцуглі капіталізму і сталі гаспадарамі сваёй краіны!

Няхай жыве савецкая ўлада!

Няхай жыве партыя бальшавікоў!

І. СТАЛІН.

Узнагарода ордэнам Леніна аб'яднаньняў нафтавай прамысловасьці і пасобных рабочых

МАСКВА, 31. Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР і Савету Народных Камісараў Аззэрбайджанскай ССР, саюзу нафтавікоў і ЦК КП(б) Аззэрбайджану і абласнога камітэту УсеКП(б) Чачэнскай аўтаномнай вобласьці ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У АДЗНАКУ ВЫКЛЮЧНАЙ І САМААХЯРНАЙ РАБОТЫ РАБОЧЫХ, ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ І АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫХ РАБОТНІКАЎ УЗНАГАРОДЗІЦЬ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА АЗЭРБАЙДЖАНСКУЮ НАФТАВУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ З УСІМІ ЯЕ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ І ГРОЗЬНЕНСКУЮ НАФТАВУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ — «ГРОЗНАФТА» З УСІМІ ЯЕ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ.

За асабліва выключную работу, праяўленую ў барацьбе за выкананьне пяцігадовага пляну ў нафтавай прамысловасьці за 2½ гады, узнагародзіць ордэнам Леніна 55 ТАВАРЫШОЎ — ударнікаў—рабочых, інжынэрна-тэхнічнага і адміністрацыйнага пэрсаналу «АЗНАФТЫ» і 35 ТАВАРЫШОЎ — «ГРОЗНАФТЫ».

РАБОТА ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ ЗНАЧНА ПАЛЕПШЫЛАСЯ

МАСКВА. Паводле папярэдніх даных НКПС работа чыгуначнага транспарту ў сакавіку палепшылася. У сутках грузілася ў сярэднім 38,7 тыс. вагонаў, а ў лютым—36.000 вагонаў. У сакавіку сярэднясутачная пагрузка расла з пяцідзеўкі ў пяцідзеўку і дала ў пятую пяцідзеўку сярэднясутачную пагрузку 46.470 вагонаў. Спаравая ядзя [illegible] вагонаў, а ў лютым 1.890 вагонаў і тахчыкаў.

40 мільярдаў кілёват-гадзін электраэнэргіі

Абмеркаваньне пляну вырашэньня ангарскай праблемы

МАСКВА, 24. Спэцыяльная камісія Дзяржпляну СССР пад старшынствам тав. ЛОМАВА абмеркавала плян вырашэньня ангарскай праблемы.

Рака Ангара ва Ўсходняй Сібіры і яе прытокі зьяўляюцца невычэрпальнай крыніцай таннай водная энэргіі. На першых устаноўках на рацэ Ангары можна атрымаць 40 мільярдаў кілёват гадзін электраэнэргіі, што складае каля ½ усёй электраэнэргіі, якая зараз вырабляецца ПАЗШ. У раёне Ангары маюцца шматлікія месцанараджэньні матэраў і вялізарныя лясныя масывы.

Прафэсар Аляксандраў у дакладзе аб ангарскай праблеме зазначыў, на неабходнасьць алгачасовага вырашэньня праблемы Чарамхоўскага вугальнага басэйну, з запасам вугалю ў 52 мільярды тон, а таксама нядаўна адкрытага Канскага басэйну, з запасам у 80 мільярдаў тон, галоўным чынам сапранэлітавых вугляў, з якіх можна здабываць нафтапрадукты. Называючы таннай электраэнэргія Ангары дасьць магчымасьць шырока паставіць здабываньне каляровых металяў, а таксама хэмічную вытворчасьць.

Прэзыдыум Дзяржпляну прызнаў неабходным ужо ў б. г. пачаць інтэнсыўныя разьведачныя работы на Ангары з тым, каб да канца 1932 г. склаць агульную схэму ангарстрою. У энэргацэнтры стварэецца кіраўніцтва для комплектнага вырашэньня праблемы Ангары.

На разьведвацельныя і дасьледчыя работы ВСНГ у г. г. адпускае 2 млн. руб., а ў будучым годзе 3½ млн. руб. Акрамя таго, у будучым годзе павінна пачацца пабудова Чарамхоўскай цепляной электрастанцыі і вопытнага заводу для вытвор[illegible] скарыстаньня чарам[illegible] сапранэлітавага вугалю.

Шэф сілаеў

[illegible]Й ЗА СІЛАС

[illegible]кай і аднаасобнікаў

[illegible]ГА СІЛАСНАГА СЛАНЭЧНІКА ЗАМЯНІЦЬ 6 ГА ПАШЫ

[illegible]лас пад ударам апартуністаў

[illegible]ным з вуглавых пытаньняў разьвіцьця жывёлагадоўлі зьяўляецца моцная кармавая база. Вось чаму для [illegible] для рэспублікі жывёлагадоўчага [illegible] стварэньне кармавой базы [illegible] соцыялістычнай жывёлагадоўлі [illegible] цяперашняй актуальнейшай задачай сёньняшняга дня.

[illegible]цьба за загатоўку корму становіць палітычнай задачай кожнага саўгаса, калгасу і усёй савецкай грамадзкасьці.

1. [illegible]ным з асноўных сродкаў загатоўкі зьяўляецца сіласаваньне.

[illegible]ыт мінулага году паказаў, што на сябе апраўдаў Сіласаваньне зараз [illegible] буйным практычным мерапрыемствам, рухавіком калектывізацыі. [illegible] ўсю важнасьць стварэньня 2.[illegible]вой базы і, у прыватнасьці, спраўдасьць сіласаваньня кармоў, здаралася-б, што на гаспадарчыя арганізацыі павінны [illegible] бальшавіцкай настойлівасьцю 9.[illegible]ваць плянавыя заданьні па за-7.[illegible]чэньні жывёлы кармамі. Але 5.[illegible] падрыхтоўкі да сіласнай кампаніі [illegible]31 г. сьведчаць аб тым, што калі [illegible] зараз-жа зроблен пералом у [illegible]справе, дык праграма сіласаваньня [illegible] на будзе выканана. Асобныя цыфры, як Сьвінаводтрэст, Малочнаяны трэст, Галоўпенком, скарачэньне плошчу засеву сіласных культур, [illegible]ючы, што ім столькі непатрэбна [illegible], у той час, калі насельнем саўгасаў [illegible]. Абязьпечваюцца ў першую чаргу. [illegible]нкалгасцэнтры паваг не пацікавіліся паглядзець у плян нагеннага зачачэньня—колькі насельня сілаводукультур выканчана для калгасаў [illegible]. [illegible]наяж сіласаваньня асобнымі трэстамі: Галоўпенком, скарочаны на 800 ны заданьне 2.000 тон), Сьвінавод—81[illegible] тысяч тон (заданьне 60 тысяч). [illegible]ча ленш, і в будаўніцтвам сілясных [illegible], ям і траншэй. Факт скліцаньня [illegible]ды гаспадарчых арганізацый па [illegible] будаўніцтве тры разы, ужо [illegible]ваць аб тым, наколькі адсутнічае [illegible] справы сіласаваньня.

[illegible]шчесьпі—якому даручана будаўніцтву стандартных сілясных вежаў, ня [illegible] для ВССР, але і для іншых рэсабік Савецкага Саюзу,—да будаўніцтва [illegible] гэта справу пасорыць, у той [illegible] калі ўжо ў першым квартале 1931 г. [illegible]

[illegible]ным з вуглавых пытаньняў разьвіцьця жывёлагадоўлі зьяўляецца моцная кармавая база. Вось чаму для [illegible] для рэспублікі жывёлагадоўчага [illegible] стварэньне кармавой базы [illegible] соцыялістычнай жывёлагадоўлі [illegible] актуальнейшай задачай сёньняшняга дня.

[illegible]цьба за загатоўку корму становіць палітычнай задачай кожнага саўгаса, калгасу і усёй савецкай грамадзкасьці.

1. [illegible]ным з асноўных сродкаў загатоўкі зьяўляецца сіласаваньне.

[illegible]ыт мінулага году паказаў, што на сябе апраўдаў Сіласаваньне зараз [illegible] буйным практычным мерапрыемствам, рухавіком калектывізацыі. [illegible] ўсю важнасьць стварэньня 2.[illegible]вой базы і, у прыватнасьці, спраўдасьць сілясаваньня кармоў, здаралася-б, што на гаспадарчыя арганізацыі павінны [illegible] бальшавіцкай настойлівасьцю 9.[illegible]ваць плянавыя заданьні па за-7.[illegible]чэньні жывёлы кармамі. Але 5.[illegible] падрыхтоўкі да сіласнай кампаніі [illegible]31 г. сьведчаць аб тым, што калі [illegible] зараз-жа зроблен пералом у [illegible]справе, дык праграма сілясаваньня [illegible] на будзе выканана. Асобныя цыфры, як Сьвінаводтрэст, Малочнаяны трэст, Галоўпенком, скарачэньне плошчу засеву сілясных культур, [illegible]ючы, што ім столькі непатрэбна [illegible], у той час, калі насельнем саўгасаў [illegible]. Абязьпечваюцца ў першую чаргу. [illegible]нкалгасцэнтры паваг не пацікавіліся паглядзець у плян нагеннага зачачэньня—колькі насельня сілаводукультур выканчана для калгасаў [illegible]. [illegible]наяж сілясаваньня асобнымі трэстамі: Галоўпенком, скарочаны на 800 ны заданьне 2.000 тон), Сьвінавод—81[illegible] тысяч тон (заданьне 60 тысяч). [illegible]ча ленш, і в будаўніцтвам сілясных [illegible], ям і траншэй. Факт скліцаньня [illegible] гаспадарчых арганізацый па [illegible] будаўніцтве тры разы, ужо [illegible]ваць аб тым, наколькі адсутнічае [illegible] справы сілясаваньня.

[illegible]шчесьпі—якому даручана будаўніцтву стандартных сілясных вежаў, ня [illegible] для ВССР, але і для іншых рэсабік Савецкага Саюзу,—да будаўніцтва [illegible] гэта справу пасорыць, у той [illegible] калі ўжо ў першым квартале 1931 г. [illegible]

[illegible]ным з вуглавых пытаньняў разьвіцьця жывёлагадоўлі зьяўляецца моцная кармавая база. Вось чаму для [illegible] для рэспублікі жывёлагадоўчага [illegible] стварэньне кармавой базы [illegible] соцыялістычнай жывёлагадоўлі [illegible] актуальнейшай задачай сёньняшняга дня.

[illegible]цьба за загатоўку корму становіць палітычнай задачай кожнага саўгаса, калгасу і усёй савецкай грамадзкасьці.

1. [illegible]ным з асноўных сродкаў загатоўкі зьяўляецца сілясаваньне.

[illegible]ыт мінулага году паказаў, што на сябе апраўдаў Сіляс

У БАЯВОЕ НАСТУПЛЕНЬНЕ ЗА ФІНПЛ

Выкананьнем пляну мабілізацыі сродкаў забясьпечым

Цэнтр цяжару—у фінанса

НА ПРАЦЯГУ КРАСАВІКА, МАЯ І ЧЭРВЕНЯ ДАБІЦЦА

РАШУЧА ЎДАРЫЦЬ ПА ПАРУШАЛЬНІКАХ ФІНАНСАВАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Задачы пасьпяховага выкананьня фінансавага пляну любой арганізацыяй і вдзінага фінансавага пляну ў цэлым патрабуюць самага строгага правяраньня ў жыцьцё фінансавай дысцыпліны. Сьнежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) аддаў шмат увагі пытаньню фінансавай дысцыпліны.

Трэба, аднак, канстатаваць, што пастановы партыі і ўраду аб фінансавай дысцыпліне рэдам арганізацый ня выконваюцца. Парушэньні фінансавай дысцыпліны, на жаль, яшчэ маюць месца і да гэтага часу. Ня ўсе арганізацыі добра ўсьвядомілі гаспадарча-палітычную важнасьць крэдытнай рэформы. Гаспадарчыя арганізацыі да гэтага часу яшчэ цалкам не перайшлі на новыя формы крэдытнай сыстэмы. Даволі сказаць, што НІ АДНА ГАСПАДАРЧАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЯШЧЭ НЯ СКЛАЛА НАВАТ БАЛЯНСУ НА 1 КАСТРЫЧНІКА МІНУЛАГА ГОДУ.

У БЕЛРЫБЕ ў фінансавых пытаньнях панує поўная блытаніна. БЕЛКАПСАЮЗ перавысіў вызначаныя яму ліміты на 6 млн. руб., БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНЕ—на 2 млн. руб. Зусім правільна робіць Дзяржбанк, калі ў адносінах да гэтых арганізацый ужывае фінансавыя абмежаваньні, скарачаючы ім крэдыты.

Ва ўмовах напружанай барацьбы за фінплян усякае нават найменшае парушэньне фінансавай дысцыпліны зьяўляецца зусім недапушчальным. Арганізацыі, якія дапушчаюць гэтыя парушэньні, павінны прыцягвацца да адказнасьці. Фінансавыя і крэдытныя органы, якія ў першую чаргу адказваюць за выкананьне фінансавага пляну, павінны аб кожным выпадку парушэньня фінансавай дысцыпліны паведамляць кіруючым органам для прыняцьця мер узьдзейнасьці. Парушэньні фінансавай дысцыпліны павінны разглядацца ня як казначныя парушэньні фармальнага парадку, а як эпоснае ігнараваньне дырэктыў вышэйшых органаў.

Г. М.

ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА ШКЛОЎСКІХ РАЙАРГАНІЗАЦЫЙ

(Ад наш. карэспандэнта)

Шклоўская райКК-РСІ заслухала даклад аб ходзе выкананьня фінпляну першага кварталу па раёне. РайКК-РСІ адзначыла, што рад раённых арганізацый злачынна выдбайна адносіліся да выкананьня сваіх заданьняў па мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Праваапартуністычная практыка **райкалгассаюзу, райземаддзелу і МТС прывяла да поўнага правалу кампаніі па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.** Паводле заданьня, па раёне павінна б'ю быць распаўсюджана акцый на 39.600 руб., распаўсюджана-ж толькі... на 727 руб.

Такое-ж становішча і з паступленьнем аднаразовага збору. Раённыя арганізацыі ня ўжылі мер для своячасовага спагнаньня збору. У выніку на сёньняшні дзень паступіла толькі 25 проц. налічанага.

Раённы **савет прафсаюзаў і гарсавет** не аддавалі ніякай увагі мабілізацыі сродкаў. Райпрафсавет не мабілізаваў прафсаюзную масу вакол гэтай важнейшай кампаніі. Фабрычна-заводзкія арганізацыі і камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе на мясцох нічога не зрабілі для забесьпячэньня выкананьня заданьняў па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады». На радзе прадпрыемстваў пазыкай ахоплена менш паловы рабочых. Так, на фабрыцы **«Спартан»** ка пазыку падпісалася толькі 34,8 рабочых, на фабрыцы **«Барацьба»** — 32 проц. КК-РСІ кваліфікавала ўсе гэтыя факты, як выпік праваапартуністычных адносін да мабілізацыі сродкаў з боку прафсаюзных арганізацый раёну.

Раённая газэта **«Прамень камунізму»** невыстарчальна змагалася за выкананьне фінпляну, не даволі мабілізавала масы вакол гэтай кампаніі.

РайКК-РСІ абвясьціла суровую вымову загадчыку райза тав. **Шоху,** старшыні райкалгассаюзу тав. **Буйвалаву** і дырэктару МТС т. **Кляшчову** за невыкананьне заданьняў па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

За невыкананьне кантрольнага заданьня па сыстэме райкаапсаюзу старшыні апошняга тав. **Грышчанку** абвешчана суровая вымова.

За фармальна-бюракратычныя адносіны да мабілізацыі сродкаў з боку райпрафсавету, райКК-РСІ абвясьціла суровую вымову б. старшыні яго тав. **Леванту.** Абвешчана вымова таксама заг. раённага спажывецкага т-ва і кіраўніку райканторы Дзяржбанку.

Для ліквідацыі прарыву ў выкананьні фінпляну першага кварталу райКК-РСІ пастанавіла мабілізаваць і накіраваць на месцы ўвесь актыў раёну.

Н.

ФІНПЛЯН—ПАД ПАГРОЗАЙ

ЖЛОБІН (Наш кар.).

Раённыя арганізацыі адносяцца недапушчальна няўважліва да мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Райкаапсаюз выканаў свае квартальнае заданьне толькі на 4,3 проц. Па крэдытным сыстэме паступленьне паёў і мэтавых узносаў складае толькі 13 проц. пляну, па жыльлёвай каапэрацыі—18 проц.

Райкалгассаюз палец аб палец на стукнуў для распаўсюджаньня акцый Трактарэцэнтру. Да гэтага часу па раёне не рэалізавана ні аднэй аблігацыі.

Аднаразовы збор спагнаны толькі на 70,2 проц. Раённыя арганізацыі праяўляюць недапушчальную літасьць да кулакоў. Даволі сказаць, што з 5.500 руб., налічаных на кулакоў па аднаразовым зборы, на сёньняшні дзень спагнана толькі... 750 руб. Сельгаспадатак спагнаны з кулакоў толькі а 40 проц.

Трэба зараз-жа ўжыць меры для ўзмацненьня мабілізацыі сродкаў па раёне. Вінаватыя ў зрыве гэтай кампаніі павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Машніцкі.

ЗРЫУШЧЫКІ ФІНПЛЯНУ ПРЫЦЯГВАЮЦЦА ДА АДКАЗНАСЬЦІ

ЛАГОЙСК. (Наш кар.).

Лагойскае спажывецкае т-ва зусім ня цікавіцца і ня кіруе работай сваёй сыстэмы. У цэлым радзе крам панує безгаспадарчасьць і бясплянаваасьць. Ёсьць факты растрат. Так, у загадчыка кніжнай крамы **Пшэўоцкага** выяўлен недахват тавараў на 2.600 руб. У загадчыка бакалейнай крамы **Нісьневіча** выяўлен, наадварот, лішак тавараў на 3.200 р., у крамніка **Гразоўскага**—лішак на 280 руб., у загадчыка базай спажывецкага т-ва **Палера**—лішак на 850 руб. Палер злоўжываў сваім становішчам і прысвойваў сабе каапэрацыйныя сродкі.

Запазычанасьць спажывецкаму т-ву розных устаноў і прыватных асоб складае каля 22.000 руб. Праўленьне т-ва не зварачае на гэта ніякай увагі і ня ўжывае мер для спагнаньня запазычанасьці. Мабілізацыя сродкаў для праўленьня—на апошнім плане.

Старшыня праўленьня т-ва **Сільвэструк** займаўся самазабесьпячэньнем дэфіцытнымі прамтаварамі. Сільвэструк заладваў членам праўленьня, інструктарам і крамнікам выдаваць дэфіцытныя тавары яго прыяцелям. За кароткі час Сільвэструк выдаў на атрыманьне дэфіцытных тавараў... 46 асабістых запісак.

Пракуратура, якая расьследвала гэту справу, прыцягне да суровай адказнасьці старшыню праўленьня спажывецкага т-ва Сільвэструка, яго намесьніка Астрашэўскага, загадчыка базы Палера і крамнікаў Рольніка, Маслоўскага, Кохана, Пшэўоцкага і Нісьневіча.

Патыраюць кулакам

ТАЛАЧЫНО (Наш кар.).

Мабілізацыя сродкаў па Талачынскім раёне праходзіць недапушчальна марудна. Паводле вестак райфа на 20 сакавіка плян выкананы на 49 проц. Але і гэта лічба зьяўляецца сумніўнай, бо загадчык райфа **Трушчанка дасылае Наркамфіну няправільныя весткі.** Так, на 10 сакавіка загадчык райфа паказаў на аднаразовым зборы суму ў 72.097 р., на справе-ж на раёне паступіла толькі 65.322 руб. Такім чынам, весткі райфа аказаліся дутымі.

Райфа і райвыканком патыраюць кулаком. Замест таго, каб прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі ўнесьці належныя з іх плацяжы, **загадчык райфа Трушчанка і старшыня РВК Гаўрусеў сьпісалі э кулакоў каля 16 тысяч руб.**

Праваапартуністычная практыка нагладзецца таксама ў радзе сельсаветаў раёну (**Друцкі, Новасельскі** і інш.). У гэтых сельсаветах кулацкія гаспадаркі яшчэ нават ня выяўлены.

Спадзяюцца на самацёк

МАЗЫР. (Наш кар.). На радзе прадпрыемстваў Мазырышчыны вельмі дрэнна праходзіць мабілізацыя сродкаў. Парт'ячэйкі і заводзкія камітэты спадзяюцца выключна на самацёк.

На фанэрнай фабрыцы **«Чырвоны Кастрычнік»** з 650 пастаянных рабочых падпіскай на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» ахоплена толькі 536 чалавек. На фабрыцы працуе 460 сэзонных рабочых, але сярод іх ніякай працы па рэалізацыі пазыкі не вядзецца.

Каса ашчаднасьці, якая існуе пры фабрыцы, амаль зусім не працуе. Замест прыліву ўкладаў, у касе за апошні час ёсьць значны адліў. Камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе існуе толькі на паперы.

Такое-ж становішча і на фабрыках **«Пралетарый» і «Дрэвапрацоўчык».** Значная частка рабочых гэтых фабрык не ахоплена падпіскай.

Мазырскі РК КП(б)Б павінен неадкладна абсьлядаваць работу фабрычна-заводзкіх арганізацый у галіне мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Ашчадкасы Барысаўшчыны бязьдзейнічаюць

БАРЫСАЎ (Наш кар.). Ашчадкасы Барысаўшчыны працуюць зусім дрэнна. Яны выканалі свае заданьні толькі на 35 проц. На фабрыках і заводах Барысаўшчыны ашчадсправе аддаецца вельмі мала ўвагі. Сакратар партыйнага калектыву ф-кі «Чырвоная Бярозіна» паўгат ня ведае кантрольных лічбаў свайго прадпрыемства па ўцягненьні ўкладаў.

У сельсаветах і калгасах камісіі садзейнасьці дзяржкрэдытаў і ашчадсправе бязьдзейнічаюць, а ў радзе калгасаў іх зусім няма.

З усіх ашчадкас раёну толькі ашчадкаса № 23 выканала сваё заданьне на

Прафсаюзы - тварам да фінпляну!

Прэзыдыум ЦСПСВ адзначыў, што прафарганізацыі да гэтага часу не аддавалі належнай увагі мабілізацыі сродкаў насельніцтва. У радзе прафарганізацый паглядаліся дэмабілізацыйныя настроі, недапушчальная нядбайнасьць у мабілізацыі ўвагі рабочых мас на выкананьне фінансавага пляну.

ЦСПСВ абавязаў прафарганізацыі разгарнуць бальшавіцкія тэмпы работы з тым, каб забясьпечыць ліквідацыю прарываў першага кварталу і выкананьне фінпляну другога кварталу. Адказнасьць за правядзеньне гэтай работы ўскладзена на старшынь ЦП саюзаў і

Там, дзе мабілізацыя сродкаў—на апошнім пляне

ХАЛОПЕНІЧЫ (Наш кар.).

На працягу першага кварталу па Халопеніцкім раёне, паводле пляну, паўінна паступіць 197.900 руб. між тым, на 23 сакавіка паступіла ўсяго 134.000 руб.

ТАКІМ ЧЫНАМ, РАЁН ЯШЧЭ НЯ ВЫКАНАЎ СВАЙГО ЗАДАНЬНЯ НА 63.500 РУБ. Сем дзён, якія засталіся да канца месяца, наўрад ці дадуць пералом у ходзе мабілізацыі сродкаў, бо раённыя арганізацыі няўважліва адносяцца да гэтай важнейшай кампаніі.

Пасьпехі разгортваньня калгаснага руху—вынік актыўнага ўдзелу рабочай класы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў штодзённай рабоце па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Вялізарны пад'ём творчай ініцыятывы рабочых парадзіў рад новых форм арганізацыйнага кіраўніцтва рабочай класы працэсамі сацыялістычнай перабудовы вёскі. Задача прафсаюзаў—стаць на чале гэтага шырокага руху рабочых мас.

Ленінская фармулёўка рэзалюцыі XI зьезду УсеКП(б) выразна вызначае ролю прафсаюзаў у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі: «Будаўны школай камунізму паогул, прафсаюзы павінны быць у прыватнасьці школай кіраўніцтва сацыялістычнай прамысловасьцю (а потым паступовага **зямляробства)** для ўсёй масы рабочых, а потым і для ўсіх працоўных». Гэта адзіна правільная ўстаноўка нашай партыі падмадала атады апартуністаў, якія імкнуліся звузіць задачы прафсаюзаў, адмежаваць іх ад удзелу ў перабудове сельскай гаспадаркі.

Другая бальшавіцкая слуба—вырашэньне задачы завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў бягучым рашаючым годзе пяцігодкі. Гэта вызначае і тыя навялічаныя патрабаваньні, якія ўскладаюцца на прафсаюзы, як масавую арганізацыю рабочай класы.

Трэба з усёй выразнасьцю падкрэсьліць, што **ня ўсе прафсаюзныя арганізацыі Беларусі ўлічылі ўсю грандыёзнасьць і адказнасьць гэтага важнейшага вучастку работы,** ня ўсе прафсаюзныя арганізацыі адвялі гэтай рабоце належнае месца, ня ўзьнялі яе на адпаведную палітычную вышыню, ня адолелі стаць на чале ўзросшай ініцыятывы і актыўнасьці рабочых мас, якія аказваюць вялікую дапамогу ў перабудове сельскай гаспадаркі.

Задачы бягучай пасеўкампаніі патрабуюць гібкасьці, апэрацыйнасьці ад усіх звяньняў прафарганізацый, пачынаючы ад ЦП саюзаў і канчаючы нізавой першапачатковай прафячэйкай.

Абвешчаны газэтай «Зьвязда» сумесна з ЦКК КП(б)Б, НКЗ і Калгасцэнтрам двухдзённік генэральнай праверкі падрыхтоўкі да сяўбы патрабуе безадкладнага ўключэньня прафсаюзаў у гэту важнейшую работу. Між тым, ні адно ЦП саюзу яшчэ не дапо ніякіх дырэктыў па гэтым пытаньні мясцом, не абгаварвала яго на прэзыдыуме. У ЦП саюзу гарбароў і работнікаў металапрацоўчай прамысловасьці нават яшчэ ня чыталі газэт і нічога ня ведаюць аб агітадзе.

А які ўдзел, якое кіраўніцтва ЦП саюзу ў справе падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі?

Які ўзор апартуністычнай подмацэнкі гэтай адказнейшай гаспадарча-палітычнай работы паказвае ЦП саюзу гарбароў. ЦП ніяких канкрэтных мер не прыняло да мабілізацыі рабочых мас вакол задач пасеўнай кампаніі, не падрыхтавала апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай работай. ЦП саюзу гарбароў, **нават, не абгаварыла пытаньне аб удзеле саюзу ў пасеўнай кампаніі на апошнім пленуме** ЦП, які адбываўся ў лютым месяцы. Што робіцца на мясцох, які ўдзел прымаюць члены саюзу гарбароў у падрыхтоўцы да пасеўкампаніі ЦП саюзу ня ведае. Ніякай справаздачнасьці перад ЦП у гэтай галіне няма. Цэнтральнае праўленьне **нават ня мае вестак,** што зроблена прадпрыемствамі гор. Менску на ўдзеле ў падрыхтоўцы да сяўбы. І ЦП, ня адмечаўшы пададзіць гэтай справы, зараз толькі завярушылася, але і тут падышло па-бюракратычнаму—арганізавала 4 брыгады для праверкі гэтай работы на фабзаўмясцкомах прадпрыемстваў гор. Менску. Ці ня больш мэтазгодна было-б гэтыя брыгады пасылаць непасрэдна для ўдзелу ў пасеўкампаніі, а аб рабоце ФЗМК пастаніць даклады на пасяджэньні ЦП.

ЦП абяцае, што толькі **8 красавіка** будуць у яго матар'ялы аб удзеле саюзу ў пасеўкампаніі.

Ня дзіва пасьля гэтага, што, у выніку такой работы ЦП, па ўсім саюзе прымала ўдзел у падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі... 45 членаў саюзу, што пэфработа пастаўлена з рук вон слаба.

Няма вестак аб удзеле нізавых прафарганізацый у пасеўкампаніі і ў **ЦП работнікаў металапрацоўчай прамысловасьці. ЦП ведома, што па Беларусі працуе 124 члены саюзу па дапамозе пасеўкампаніі, але што імі зроблена, якую работу праводзяць, вынікі шэфскай работы—у ЦП вестак няма.** Праўда, ЦП зьвярнулася з ядовая да «25-тысячнікаў», паслала ліст да ФЗМК аб удзеле ў пасеўкампаніі, прымацавала асобных рабочых калектывы да прыгаралных гаспадарак, але не паладзіла штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай работай.

Па саюзе **работнікаў прамысловага і камунальна-жыльлёвага будаўніцтва** толькі за апошні час паглядаецца некаторае ажыўленьне ў рабоце па ўдзеле ў пасеўкампаніі. ЦП паладзіла справаздачнасьць месц і паслала на месцы брыгады для праверкі і дапамогі ў правядзеньні кампаніі. Пры дапамозе рабочых Будаўдзіцьвіна ў Барысаве арганізаваны 3 калгасы, да якіх прымацаваны рабочыя брыгадзіры. Брыгада асіпавіцкага групкому дапамагла давесьці плян пасеўкампаніі да кожнага двара—далішфнага калгасу. **Рабочыя Белжыльсаюзу** правялі лётарэю, якая дала 400 рублёў. Грошы пашлі на культурныя патрэбы падшэфнага калгасу, 160 рабочых Белжыльсаюзу адпрацавалі сваё выхадны дзень у прыгаралным саўгасе МЦРК, устанавілі 200 парнікоў і адрамантавалі 66 рам. У **Гомелі** праведзена прымацаваньне сельсаветаў і калгасаў да пасобных нізавых арганізацый. Адпак, мясцовыя прафарганізацыі ня ўключыліся ў конкурс, абвешчаны ЦК саюзу па лепшы ўдзел у пасеўкампаніі, слаба кіруюць кампаніяй падрыхтоўкі да сяўбы.

З чна лепш паладзена работа на саюзе **Працасьветы.** ЦП саюзу здолела мабілізаваць масы асьветнікаў на актыўны ўдзел у пасеўкампаніі, на выкананьне сандагавору, які заключан паміж ЦП саюзу працасьветы Беларусі з Уральскім і Паўночна-Каўкаскім краявым аддзелам працасьветы. За апартуністычную бязьдзейнасьць у пасеўкампаніі ЦП саюзу распушчаны 2 райкамсекрэтары (**Лоева і Койданава**). ЦП атрымлівае падкална інфармацыю з месц аб выніках работы асьветнікаў па падрыхтоўцы да пасеўкампаніі.

У **Парыцкім раёне** асьветнікі арганізавалі новых 5 калгасаў, рыхтуюць 12 кіраўнікоў дзіцячых пляцовак на час пасеўнай кампаніі, у парадку грамадзкай нагрузкі працуюць на курсах на падрыхтоўцы рахункаводаў для калгасаў 7 настаўнікаў. У **Расьнянскім раёне** асьветнікі арганізавалі 10 калгасаў. Сёлаві асьветнікаў **Старобінскага** раёну праведзена 130 сходаў, даведзен пасеўны плян да кожнага двара, арганізавана новых **10 калгасаў.** Асьветнікамі гор. **Маргілеву** арганізаваны 3 калгасы. Вялікую работу праводзяць асьветнікі па зборы попелу і ачыстцы насеньня.

Былы штаб культэстафеты, які існаваў пры ЦП саюзу працасьветы, зараз пераключыўся на кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы. Штаб арганізаваў палёт на культустановы г. Менску з мэтай праверкі іх удзелу ў падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі. Праверка ўстанавіла палезнай цікаўнасьці малочак. Работа ў гэтай галіне фактычна яшчэ не пачалася.

Азнаямленьне з кіраўніцтвам справай падрыхтоўкі да пасеўкампаніі з боку іншых ЦП саюзаў (жывёлагадоўчых саўгасаў і інш.) паказвае аб адсутнасьці пастаяннай работы ў гэтай галіне, аб недаацэнцы важнасьці гэтай справы з боку раду саюзаў.

Посьпех другой калгаснай сяўбы залежыць ад арганізацыі працы ў калгасах. Між тым, адна з асноўных задач работнікаў прафсаюзаў—перадача ў калгасы **практыкі сацыялістычных форм працы нашых заводаў і фабрык ня ўсюды яшчэ ўсьвядомлена.**

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычным тлумачэньні пастановы ЦК і СНК, якая забараняе мабілізацыю рабочых ад вытворчасьці на бягучыя кампаніі. Пастанова ні ў якім разе не раўнае аслабіць работу рабочага прафсаюза і дапамогу пасеўкампаніі. Усякім спробам узвяліць віну за сваю бязьдзейнасьць і наўменьне стаць на чале нінішнятыя мас на зусім правільную пастанову партыі і ўраду трэба даць рашучы і бязьлітасны адпор.

Д.

Шырэй удзел прафсаюзаў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы

Папойка ды распуста замест грамадзкай работы

На Бягомльскім раёне саюз працасьветы налічвае больш 120 членаў. Амаль усе яны настаўнікі, культурная сіла раёну і, здаецца, яны павінны былі-б прымаць самы актыўны ўдзел у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы, у прыватнасьці—у падрыхтоўцы да бальшавіцкай весны.

Але-ж факты гавораць за тое, што частка настаўніцтва Бягомльшчыны пасьпула адносіцца да падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, а замест гэтага займаецца гульнёй у карты, п'янствам. Так, настаўнік Лук'ч, з вёсці Кліцкі, п'яны прагуляў у карты школьныя грошы. Настаўнік Шэаб п'е бяз просыпу. Такіх фактаў можна знайсьці шмат.

Частка настаўніцтва варожа адносіцца да прыстасаваньня новых мэтадаў у школе. Настаўнік бягомльскай сямігодкі Грынюк на працягу двох год гаворыць, напрыклад, што лябараторны мэтад псуе дзяцей, што крытыка ды самакрытыка—гэта палёп ды хлусьня, а грамадзкая работа—пуль. Вось асьветнікі, якія ўсялякі чынам імкнуцца да разлажэньня калгасаў.

Усяго гэтага ня бачыць дагэтуль райсмясцком працасьветы. Старшыня мясцкому Хадасэвіч гаворыць:

— Я перагружан важнымі пытаньнямі, я павінен палішваць ды пісаць цыркуляры і дырэктывы. Трэба, каб у першую чаргу была наладжана канцылярыя!

Яшчэ і па сёньняшні дзень школы ў раёне не ахоплены ўдарніцтвам і сацпаборніцтвам.

Пры складаньні калектыўнага дагавору райсмясцкомам была дапушчана грубая палітычная памылка. У пунктах гэтага дагавору ня былі прадугледжаны ніякія абавязацельствы з боку асьветнікаў: ні па палянізацыі працоўнасьці працы і дысцыпліны, ні па ўдзеле ў грамадзкай рабоце. Толькі дзякуючы ўмяшаньню райкому партыі, гэта памылка была выпраўлена.

Надоўны настаўнікі самі сабе зрабілі вакацыі і разьехаліся, а мясцком працасьветы гэта ня ведаў.

Райпрафсавет зусім ня кіруе раённым мясцкомам працасьветы. Зараз за дапушчэньне разлажэньня часткі членаў саюзу і перазагаваньне на гэта, за правы правага апартунізму ва ўсёй рабоце, фракцыі КП(б)Б райсмясцкому працасьветы абвешчана вымова, старшыня яго Хадасэвіч зьнят з работы.

Але на гэтых арганізацыйных вывадах нельга спыніцца. Трэба неадкладна мабілізаваць увагу ўсіх асьветнікаў на зьнішчэньне дапушчаных прарываў. У радах асьветнікаў няма месца тым, хто ўхіляецца ад грамадзкай работы, хто п'яноствуе ды туляе ў карты.

У аснову далейшай дзейнасьці райсмясцкому павінна легчы падніцьцё якасьці работы, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, актыўны ўдзел у калектывізацыі вёскі.

У часе генэральнае праверкі падрыхтаванасьці калгасаў БССР да другой бальшавіцкай весны, бягомльскія асьветнікі не павінны быць у хвасьце!

Віталі Горскін.

ПРАФСАЮЗЫ НЯСУЦЬ АДКАЗНАСЬЦЬ

за посьпех веснавой сяўбы

ЦП саюзу гарбароў не наладзіла апэрацыйнага кіраўніцтва нізавымі прафячэйкамі ў справе падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі

Шырэй удзел прафсаюзаў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы

ШТО АЗНАЧАЕ:

„ЗА ЦІ СУПРОЦЬ КАЛГАСУ“

«Метад суцэльнай калектывізацыі зьяўляецца тым неабходным мэтадам, без якога немагчыма выкананьне пяцігодовага пляну калектывізацыі ўсіх абласьцей СССР. Як можна ад яго адмаўляцца, ня здраджваючы камунізму, не здраджваючы інтарэсам рабочай класы і сялянства» (Сталін).

1. Паміж двума зьездамі

XVI партыйны зьезд, які адбыўся ў чэрвені 1930 г., увайшоў у бальшавіцкую партыйную гісторыю, як зьезд разгорнутага наступленьня сацыялізму на ўсім фронце, ліквідацыі кулацтва як класы і правядзеньня ў жыцьцё суцэльнай калектывізацыі. XVI зьезд кан сакраваў вялізарнейшы пералом сусьветна-гістарычнага значэньня ў развіцьці сельскай гаспадаркі СССР.

Чым характарызаваўся гэты пералом? Тым, што «значная частка серадняцкай масы ў важнейшых збожавых раёнах, сьледам за беднякамі зразумела перавагі буйной арамадзанай гаспадаркі, аб'ядналіся добраахвотна ў калгасы і правёўшы сяўбу на калектыўных палёх, і павярнула на сацыялістычны шлях», што на базе суцэльнай калектывізацыі раду раёнаў СССР мы перайшлі ад ранейшай палітыкі абмежаваньня і выцясьненьня капіталістычных элемэнтаў у вёсцы да новай палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класы. Да XVI зьезду партыі ў асноўных збожавых раёнах калектывізацыя ахапіла 40-50 проц. сялянскіх гаспадарак. Па ўсім СССР калгасамі было ахоплена каля адной чэцвэрткі сялянскіх гаспадарак. У эканоміцы вёскі адбыліся карэнныя сацыяльныя зрухі і ў рэзультаце масавага разьвіцьця калгасаў і саўгасаў на аснове шпаркіх тэмпаў разьвіцьця сацыялістычнай індустрыі і пачатай ліквідацыі кулацтва, вымяняліся самыя суадносіны розных эканамічных укладаў у гаспадарцы СССР. У сьвятле гэтых карэнных клясавых зрухаў **па-новаму** паўстала пытаньне аб апоры савецкай улады ў вёсцы. «З гэтага часу,—падкрэсьліў зьезд партыі, — у важнейшых збожжавых раёнах СССР вёска падзяляецца на дзве асноўныя часткі: на кулацкую, якія зьяўляюцца сапраўдныя і трывалай апорай савецкай улады, і на некалгасьнікаў з беднаты і серадняку, якія пакуль яшчэ не жадаюць увайсьці ў калгасы, але якіх масавы вопыт калгасаў пераканае ў адносна кароткі тэрмін у неабходнасьці ўступіць на шлях калектывізацыі».

VI Усесаюзны зьезд саветаў адбыўся ў сакавіку 1931 г. праз 8 месяцаў пасьля партыйнага зьезду і праз тры месяцы пасьля аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК. Якія вымены ў суадносінах клясавых сіл адбыліся за гэты перыяд? Чым адзначаецца перавал паміж партыйным зьездам і зьездам саветаў?

Асноўнае заключаецца ў тым, што ленінскія пастановы зьезду нашай партыі сталі на справе магутным пабуджальнікам далейшага руху бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы. Рашучы паварот серадняцкіх мас да сацыялізму пагыбіўся, ахапіўшы новыя раёны нашай краіны.

У абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы цэмэнтаваліся і мацнелі дзесяткі тысяч калгасаў. Першая бальшавіцкая вясна з усімі яшчэ недахопамі калгаснага вытворства нагладна выявіла перад мільёнамі сялянскіх гаспадарак вялізарныя перавагі арамадзанай, арцельнай, калектыўнай вытворчасьці. Першая бальшавіцкая восень 1930 г. гэтыя перавагі яшчэ больш падкрэсьліла. Кожнаму беднаку і серадняку—аднаасобніку стаў відавочным рэзкі кантраст у даходнасьці калгасьніку і аднаасобніку. Раскрыліся нябачаныя магчымасьці для пшаркага пад'ёму традыцыйнасьці працы і яе аблігчэньня, для росту матар'яльнага становішча бядняцка-серадняцкіх мас, якія аб'ядналіся ў калгасы. Моцныя факты калгаснай эканомікі паскорылі ліквідацыю хістаньня новых мільёнаў беднякоў і сераднякоў, выраўнаўшых ужо для сябе пытаньне аб калгасным шляху, як аб адзіным шляху, які вызваляе іх з галечы і кулацкай кабалы. Ужо ўвесну мінулага году мы мелі выпадкі масавага выхаду аднаасобнікаў разам з калгасьнікамі ў поле, каб арэць у адну баразну Энтузіязм калгасьнікаў — беднякоў і сераднякоў, якія вышлі на бязьмежныя палі арганізавана і дружна, умацоўваў веру ў калгасны шлях, цэмэнтаваў давер'е да арцельнай вытворчасьці. Многа аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, не ўваходзячы ў калгасы, перапачатковымі калектыўнымі спосабамі апрацоўвалі зямлю, выходзілі на ворыва, сяўбу, уборку, сустракаючы нярэдка актыўнае падтрыманьне з боку саміх калгасьнікаў.

Моцныя калгасныя факты «прымушалі» беднякоў і сераднякоў да іх прыглядацца, прыслухоўвацца. Аб чым гаварылі гэтыя факты? Аб тым, што ў калгасах пасеў на адзін двор складаў увесну 1930 г. — 5,2 гэктараў, а ў аднаасобніку — толькі 2,7. Яшчэ больш значнай была гэта розьніца па асноўных збожжавых раёнах. Там пасеў на адзін двор у калгасах складаў 7,7 гэктараў, а ў аднаасобніку — 3,7 гэктараў. Уся пасеўная плошча калгасаў складала ў 1928 г. (пасеў веснавы і асеньні) — 2 млн. гэктараў, у 1929 г. — 6,5 млн. гэкт., а ў 1930 г. — 43 млн. гэктараў. Конь у калгасным гаспадарцы ў 1930 г. апрацоўваў у 1½-2 разы большую плошчу, чым у аднаасобнай бядняцка-серадняцкай гаспадарцы. Ураджай збожжа ў калгасах у 1930 годзе перавысіў у сярэднім ураджай ў аднаасобнай гаспадарцы на меншай меры на 10-15 проц. Рэзка павялічылася таварнасьць калгаснай гаспадаркі. Даход на душу калгаснага насельніцтва ў 1930 г. аказаўся вышэй душавога даходу аднаасобніку ня менш, чым у 1½ раза. Нарэшце, праданая дзяржаве таварная прадукцыя збожжавых культур калгасамі ў 3½ разы перавысіла разьмеры таварнага па-завяскоўага збожжа кулакоў у 1926-27 г.г. і больш, чым у 1,6 раз даваенную таварную прадукцыю памешчыцкай гаспадаркі.

Бядняк і серадняк-аднаасобнік сутыкаўся тварам у твар з гэтымі фактамі жыцьця, якія множыліся ў кожнай вёсцы, у кожнай станіцы. Да многіх аднаасобнікаў гэтыя факты прыходзілі праз крывое люстра кулака. Клясавы вораг ужываў самыя тэатральныя формы злосных шалёнай контр-рэвалюцыйнай агітацыі і дэмагогіі, самыя ліхія формы ўзьдзейнасьці на псыхіку многіх беднякоў і сераднякоў, у якіх найбольш моцна захавалася прагнасьць прыватна-ўласьніцкага накапленьня, ілюзіі дробнай уласнасьці (па сутнасьці жабрацкая). Кулацкі тэрор, запалохваньне, пагрозы (якія ня спыніліся і па сёньняшні дзень, бо клясавая барацьба ня спынілася ні на хвіліну) ня прытупіліся, а наадварот абвастрылася, павінны былі ў дапаўненьне да іншых дзікіх баек і чутак, каб перапалохаць дзікіх баек і чутак утрымаць бядняка-серадняка гаспадаркі ад уступленьня ў калгасы. Купцтва — самы заядлы вораг калгаснага руху. І гэта натуральна бо суцэльная калектывізацыя нясе канчатковую пагібель пясковаму капіталізму, бо буйная вытворчасьць саўгасаў і калгасаў заманае і выціскае кулацкую вытворчасьць. Кулак — гэты вампір і вылейпы вораг калгасаў — дзейнічаў і дзейнічае ўвесь час у адным напрамку — аганьбіць калгасы, узьняць масы супроць калгасаў, узарваць калгасы знутры шляхам адкрытага і замаскаванага шкодніцтва.

У абвостраных клясавых сутыкненьнях з гэтым асноўным і вылейным ворагам калгаснага руху і яго агентамі і саюзьнікамі ўнутры нашай партыі—правымі і «левымі» кварту́ністамі — новыя мільёны бядняцка-серадняцкіх гаспадарак станавіліся на шлях калектывізацыі.

З якім-жа рашаючым вынікам мы падышлі да VI зьезду саветаў Саюзу ССР? Тым, што калгасны шлях праверан мільёнамі сялян на іх уласным вопыце; тым, што, праверыўшы яго, бядняцка-серадняцкія масы ацанілі гэты шлях, як адзіны шлях, які вызваляе іх ад кулацкай кабалы, які вядзе да вольнага калгаснага жыцьця. І калі да моманту XVI партыйнага зьезду мы мелі ў калгасах па ўсім СССР каля ¼ сялянскіх гаспадарак, а ў асноўных збожжавых раёнах — 40-50 проц., то да VI зьезду саветаў ужо было ў калгасах па ўсім СССР 37 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а ў асноўных збожжавых раёнах 74 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Да цяперашняга моманту ў калгасы ўжо ўвайшло каля 40 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, г. зн. каля 10 млн. Галоўныя збожжавыя раёны Савецкага Саюзу завяршаюць у гэтым годзе ў асноўным суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю клясы кулацтва. Многія раёны галоўнейшых вытваравых збожжавых клясьцей цалкам калектывізаваны. Такіх раёнаў цяпер ужо не адзінкі, а дзесяткі.

Такім чынам адбыліся далейшыя карэнныя сацыяльныя зрухі, аб якіх у сваіх пастановах гаварыў XVI партыйны зьезд. І на самай справе. Калі XVI зьезд партыі, высоўваючы лёзунгі апоры на калгасьніка, канстатаваў, што ад гэтага часу ў важнейшых збожжавых раёнах СССР вёска падзяляецца на дзве асноўныя часткі: на калгасьнікаў, якія зьяўляюцца сапраўдная і моцная



1.000.000 тон сіласу

УЗЬНІМЕМ У БОЙ ЗА СІЛАС

шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў

КАМСАМОЛ,— У ПЕРШЫЯ РАДЫ АРГАНІЗАТАРАЎ КАРМАВОГА ПАХОДУ!

1 ГА СІЛАСНАГА СЛАНЭЧНІКА ЗАМЯНІЦЬ 6 ГА ПАШЫ

КАМСАМОЛ, АПРАЎДАЙ НАЗВУ ШЭФУ СІЛАСУ!

Ленінскі камсамол Беларусі ўзяў на сябе ў мінулым годзе шэфства над сіласам. Гэтыя самым камсамол узяў на сябе адказнасьць за пасьпяховае выкананьне аднаго з важнейшых і рашаючых пучасткаў кармавой праблемы, як асновы вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі.

Прыняцьцю шэфства патрабавала ад усяго камсамолу Беларусі, кожнага камітэту, кожнай ячэйкі сапраўднай баявой камсамольскай работы на поўным і пасьпяховым выкананьні ўсіх вызначаных плянаў па сіласаваньні.

Аднак, трэба з усёй выразнасьцю і настойлівасьцю падкрэсьліць, што ў мінулым годзе ЛКСМБ на практычнай рабоце сваёй ганаровай назвы шэфа сілясу — не апраўдаў.

Праграма сіласаваньня па БССР у мінулым годзе ў значнай сваёй частцы ня была выканана. За правал сіласнай кампаніі ў мінулым годзе значную частку віны нясе шэф сілясу—ЛКСМБ.

Практыка мінулага году з усёй выразнасьцю сьведчыць аб тым, што ў радзе камсамольскіх арганізацый мела месца правапартыйнастычная практыка, палітычная недаацэнка вялізарнага значэньня сілясу ў вырашэньні аднаго з рашаючых вучасткаў кармавой праблемы — сілясу.

У мінулым годзе шаасобныя камсамольскія камітэты і ячэйкі паказалі сапраўдную баявую энэргічную работу па сіласаваньні. Варта толькі ўспомніць пра прыклад ячэйкі калгасу «Расьсьвет пераможца», Жлобінскага раёну. У гэтым калгасе камсамольская ячэйка многа зрабіла на сіласным фронце. Лёзунг камсамол — на барацьбу за сілас» ячэйка адразу падхапіла і стала правадзіць яго на справе. Першым па ўсёй Беларусі «Расьсьвет—пераможца» пабудаваў дзве вялізныя сіласныя вежы. Акрамі сіласных вежаў, па ініцыятыве ячэйкі пабудавана паўвежа на 100 тон сіласнай масы.

У калгасе «АВАНГАРД», Лепельскага раёну — камсамольцамі на суботніках было пабудавана 6 сіласных ям у калгасе і адна — у суседняй вёсцы — для бедняко- і серадняко—аднаасобнікаў. Факты сапраўднай бальшавіцкай работы за выкананьне пляну сілясу паказала і ячэйка ЛКСМБ саўгасу «Іваньі» Слуцкага раёну.

Можна прынесьці яшчэ некалькі фактаў сапраўднай баявой і энэргічнай работы камсамольскіх ячэек на сіласным фронце. Але гэтыя прыклады ніякім чынам не характарызуюць агульнага становішча рэчаў. Большая частка камсамольскіх камітэтаў і ячэек не ўзяла належных бальшавіцкіх тэмпаў на сіласным фронце, зусім дрэнна правяла, а ў радзе месц поўнасьцю праваліла справу сіласаваньня.

Чым, як ня правапартыйнастычнай практыкай некаторых камсамольскіх арганізацый, можна вытлумачыць такі факт, як мізэрнае выкананьне плянаў па сіласаваньні — на 7,1 проц., саўгасы выканалі свой плян на 21,3 проц., калгасы — 9,4 проц., і амаль зусім нічога ня выканаў індывідуальны сэктар, які даў толькі 0,5 проц. выкананьня.

Імёны зараз, калі ў радзе месц адчуваецца востры недахват кармоў, асабліва адбіваюць ганебны ярлык сілясаваньня мінулага году.

Правал сіласаваньня, які меў месца ў мінулым годзе, сёлета не павінен быць дапушчан. Перад шэфам сілясу—ЛКСМБ — паўстае рад адказнейшых задач, якія ў практычнай рабоце зьбясьпечылі-б сапраўднае і поўнае выкананьне плянаў сілясаваньня.

Паводле дырэктыў партыі і ўраду, у гэтым годзе неабходна засілаваць мільён тон кармоў, давесьці ў гэтую веснавую пасеўную кампанію плошчу пад нораньплодамі да 80 тыс. гэкт., плошчу пад кармавымі травамі — да 552 тыс. гэкт.

Гэтыя лічбы зьяўляюцца мінімальнымі. Камсамольскія арганізацыі павінны в улаўшчай камсамолу энэргіяй моладзі выступіць в сустрэчнымі плянамі насустрач сіласнай кампаніі 1931 году.

Кіраўніцтва раённых камсамольскіх камітэтаў і ячэек павінна забясьпечыць поўнасьцю выкананьне пасеўных культур пад сілас.

Выканаць і перавыканаць пляны Наводнага гэктара культур, вызначаных пад сілас, не павінна быць адведзена на іншыя мэты. Поўнасьцю скарыстаць гас, які застаўся, па пачатку пасеўнай кампаніі, для баявой праверкі ўсімі камсамольскімі арганізацыямі падрыхтаванасьці саўгасаў, калгасаў і аднаасобнага сэктару да засеву культур пад сілас. З гэтай мэтай неабходна ў бліжэйшыя-ж дні правесьці сіламі «ЛК» праверку сапраўднай падрыхтаванасьці.

Камсамольскія арганізацыі павінны зараз-жа забясьпечыць вызначэньне месц пабудовы сіласных вежаў і ям, своячасовую падрыхтоўку мясцовага матар'яла да будаўніцтва і своячасовага пачатку будаўніцтва.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва вось аснову мэтад у рабоце па выкананьні плянаў сіласаваньня.

За пасьпяховае выкананьне плянаў сіласаваньня нясе адказнасьць шэф сілясу — камсамол, аб гэтым трэба памятаць усім камсамольскім ячэйкам і камітэтам.

Улічыць леташнія памылкі ў справе сіласаваньня з тым, каб не дапусьціць іх сёлета, поўнасьцю выканаць пляны сіласаваньня аднаго з рашаючых вучастка ў стварэньня кармавой базы сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

З камсамольскай энэргіяй і энтузіязмам — у бойку за мільён тон сілясу, на барацьбу за сілас, за сакавіты корм для калгаснай жывёлы.

Вынікам гэтага мы мелі значны прарыў на сіласным фронце. Замест 450 тысяч тон—36 тысяч тон сіласазанага корму ці 6 проц. выкананьня плану. Ня лепш і з сіласным будаўніцтвам. Апошнім было прадугледжана пабудова 75 стандартных вежаў сыстэмы Кінга, вытворчасьці Бабруйскага дрэвазапрацоўчага камбінату, але было завезена ў калгасы 67 вежаў, ці 89 проц. заданьня і скончана пабудовай 13 вежаў, ці 18,6 проц. вызначанага плану.

У часе зімы 1930-31 году пры розкім падхваце як моцных, так і грубых кармоў, 36 тысяч тон добра-прыгатаванага сілясу, сталі лепшым агітатарам за новыя дзесяткі і сотні тысяч тон сіласаванай масы.

У часе 8-га калгаснага зьезду будаўнікоў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, прадстаўнікі калгасаў далатна адклікаліся аб якасьці сілясу, аб уплыве на стан жывёлы, удойлівасьці.

Ад 36 тысяч да 502 тысяч тон

Праграма сіласаваньня па калгаснай сыстэме ў гэтым годзе павялічана на 71 проц.—з 36 тысяч тон да 502 тысяч сіласной масы. Праграмай прадугледжана пабудова 166 вежаў у буйнейшых малочных і сьвінагадоўчых калгасных формах ёмістасьцю у 300, 200 і 100 тон. Асыгнавана сродкаў 2 мільёны 225 тысяч руб., з якіх 1.436 тысяч складаюць крэдыты і 819 тысяч уласныя сродкі. Будаўніцтва будзе праводзіцца самімі калгасамі пры тэхнічным нагляде з боку Белкалгасбуду.

Для непасроднага кіраўніцтва пабудовай у калгасах Калгасцэнтр з спазьненьнем на месяц адкрывае 1½ месячныя курсы тэхнікаў сіласнага будаўніцтва ў Менску і Гомелі па 35 чалавек на кожных.

Праграмай прадугледжана засеў сіласных культур кукурузы і сланэчніка да 20 тысяч гэкт. Выкананьню плану пагражае недахват насеньня гэтых культур. Прарыў прыдасьцца пакрыць засевам віка-аўсяной мяшанкі, якая таксама дае багатую зялёную масу і можа быць скарыстана на сіласаваньне.

Высунем сустрэчны плян сіласаваньня

Рост калектывізацыі сельскай гаспадаркі, рост сацыялістычнай жывёлагадоўлі, вопыт сіласнага будаўніцтва мінулага году, выстарчальная колькасьць сіласнага сырцу і вялізарнейшы энтузіязм калгасьнікаў і калгасьніц у барацьбе за сіласаваны корм у гэтым годзе—гэта ўсе тыя прадпасылкі, якія высоўваюць на парадак дня пытаньне аб сустрэчным сіласным плане. Калі ўзяць толькі дарослую буйную рагатую жывёлу—1.063 тысячы кароў, дык, выходзячы з нашага пляну ў 502 тыс. тон, на адну карову прыходзіцца ўсяго 5 цэнтнераў, ці 16 проц. мінімальнай гадавой нормы сіласнай дачы, а на кожны калгас у сярэднім 100 тон. Гэта пры арганізаванай працы ўсіх калгасьнікаў самая мінімальная норма тавару, якую заўсёды можна павялічыць да 180 тон, ці на адну сіласную яму сярэдніх разьмераў на адзін калгас, **што па рэспубліцы дасьць новых 150 тысяч тон сіласаванага корму звыш пляну.**

Пытаньне сіласаваньня корму, падрыхтоўка да сіласнага будаўніцтва ў калгасах павінна быць шырока абгаворана калгасьнікамі на сходах і пасяджэньнях праўленьняў калгасаў. **На апошніх трэба разгледзець пляны сіласаваньня, даныя РКС, падлічыць свае сілы і высунуць свой сустрэчны плян, цьвёрда памятуючы, што сілас—гэта мяса, сілас—гэта малако, сыр, масла, сілас—гэта адзін з верных дапаможнікаў вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы.**

150 тысяч тон сілясу звыш пляну выканаць можна. У час міжпляну, пасьля скончэньня саўгасовай кампаніі, трэба ўжыць раньняе сіласаваньне всякі і пустазельля, якога ў нас надавычай багата.

У калгасах неабходна арганізаваць **ударныя сіласныя брыгады.** Дабіцца скончэньня пабудовы сіласных вежаў мінулага году. Арганізаваць перакліч паміж асобнымі калгасамі раёну кулаком, што робяць мільёны бядняцка беларускую перакліч калгасаў і райкалгасаўзаў за барацьбу ў падвядзеньні кармавой базы пад сацыялістычную жывёлагадоўлю.

Сілясам—зьнішчым баскорміцу.

Сілясам—павялічым таварную прадукцыю.

МАНЬКЕВІЧ.

За 150.000 тон ЗВЫШ ПЛЯНУ

ПАВІННЫ ЗМАГАЦЦА КАЛГАСЫ БССР

Добры вопыт—лепшы агітатар за сілас

У мінулым годзе праграма сіласаваньня па калгасах Беларусі была вызначана ў 450 тысяч тон сіласнага корму. Даведзеныя пляны сіласаваньня да калгасаў на сустрэлі належнага гарачага подгуку сярод калгасьнікаў. Чуліся галасы супроць сіласаваньня. Наглядалася недаацэнка гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі і з боку шаасобных прадстаўнікоў агранамії і кіраўнікоў гаспадарчых установаў, якія не змаглі мабілізаваць вакол гэтага пытаньня грамадзкую думку, павесьці калгасьніцкія масы на барацьбу за сілас, за сакавіты корм для калгаснай жывёлы.

Вынікам гэтага мы мелі значны прарыў на сіласным фронце. Замест 450 тысяч тон—36 тысяч тон сіласазанага корму ці 6 проц. выкананьня пляну. Ня лепш і з сіласным будаўніцтвам. Апошнім было прадугледжана пабудова 75 стандартных вежаў сыстэмы Кінга, вытворчасьці Бабруйскага дрэвазапрацоўчага камбінату, але было завезена ў калгасы 67 вежаў, ці 89 проц. заданьня і скончана пабудовай 13 вежаў, ці 18,6 проц. вызначанага пляну.

У часе зімы 1930-31 году пры розкім падхваце як моцных, так і грубых кармоў, 36 тысяч тон добра-прыгатаванага сілясу, сталі лепшым агітатарам за новыя дзесяткі і сотні тысяч тон сіласаванай масы.

У часе 8-га калгаснага зьезду будаўнікоў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, прадстаўнікі калгасаў далатна адклікаліся аб якасьці сілясу, аб уплыве на стан жывёлы, удойлівасьці.



Сілас пад ударам апартуністаў

Адным з вузлавых пытаньняў разьвіцьця жывёлагадоўлі зьяўляецца моцная кармавая база. Вось чаму для БССР, для рэспублікі жывёлагадоўчага напрамку, стварэньне кармавой базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі зьяўляецца актуальнейшай задачай сёнешняга дня.

Барацьба за загатоўку корму становіцца палітычнай задачай кожнага саўгасу, калгасу і усёй сялецкай грамадзкасьці.

Адным з асноўных сродкаў загатоўкі корму зьяўляецца сіласаваньне.

Вопыт мінулага году паказаў, што сілас сябе апраўдаў. Сіласаваньне зараз становіцца буйным практычным мерапрыемствам, рухавіком калектывізацыі.

Улічваючы ўсю важнасьць стварэньня кармавой базы і, у прыватнасьці, справу сіласаваньня кармоў, здаралася-б, што нашы гаспадарчыя арганізацыі павінны з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю выконваць плянавыя заданьні па забясьпячэньні жывёлы кармамі. Але тэмпы падрыхтоўкі да сіласнай кампаніі 1931 г. сьведчаць аб тым, што калі ня будзе зараз-жа зроблен пералом у гэтай справе, дык праграма сіласаваньня зноў ня будзе выканана. Асобныя сыстэмы, як Сьвінаводтрэст, Малочнамасьляны трэст, Галоўленком, скарачаюць плошчу засеву сіласных культур, матывуючы, што ім столькі непатрэбна і г. д., у той час, калі насельнем саўгасы забясьпечваюцца ў першую чаргу. У Белкалгасцэнтры нават не пацікавіліся паглядзець у плян насеннага забясьпячэньня—колькі насеньня сіласных культур вызначана для калгасаў БССР.

Тэмп сіласаваньня асобнымі трэстамі, як Галоўленком, скарочаны на 800 тон (заданьне 2.000 тон), Сьвінавод—на 37 тысяч тон (заданьне 60 тысяч).

Ня лепш, і з будаўніцтвам сіласных вежаў, ям і траншэй. Факт скапіраваньня нарады гаспадарчых арганізацый па сіласным будаўніцтве тры разы, ужо сьведчыць аб тым, наколькі адсутнічае ўвага справы сіласаваньня.

Лесбел—якому даручана будаўніцтва стандартных сіласных вежаў, ня толькі для БССР, але і для іншых рэспублік Савецкага Саюзу,—**да будаўніцтва яшчэ да гэтага часу не прыступіў** і ня думае гэту справу паскорыць, у той час, калі ўжо ў першым квартале 1931 г. павінна быць выпушчана 250 вежаў. На сёнешні дзень не пабудавана ні адной вежы.

Асобныя сыстэмы, як Сьвінаводтрэст, Белкалгасцэнтр, ня ведаюць навэтка, колькі і дзе яны будуць будаваць сіласных вежаў. Калгасцэнтр, замест вызначаных крэдытаваньнем 125 стандартных вежаў і 285 мураваных, памячае пляны будаўніцтва ўсяго на 165 вежаў, матывуючы, што каля 45 проц. сродкаў трэба выдаткаваць на будаўніцтва ям і траншэй, у той час, калі будаўніцтва прасьцейшых відаў сіласных установак: з хварасьцянной абліцоўкай, драўлянай не патрабуе значных сродкаў і можа быць праведзена гаспадарчым спосабам.

Будаўніцтва прасьцейшых відаў сіласных установак, ям і траншэй, у якія будзе заложана асноўная маса сіласных расьлін і адкідаў паляводства і агародніцтва, таксама знаходзіцца ў неадпавальняючым становішчы.

Белсельбуд і Белдзяржвыдавецтва павінны выпусьціць спэцыяльную лістоўку-брашуру, або плякат, каб кожны калгас, саўгас, камсамольская ячэйка і іншыя зацікаўленыя ўстановы і арганізацыі змаглі на месцы атрымаць мінімум ведаў па будаўніцтве ям і траншэй і не чакаць, пакуль атрымаецца такі матар'ял з Масквы. Трэба таксама хутка выдаць і інструкцыю па тэхніцы сіласаваньня.

Падрыхтоўка кадраў, асабліва па будаўніцтве вежаў і траншэй, яшчэ не распачата. НКЗВ і Белкалгасцэнтр мерка валі адкрыць курсы на 60 асоб 20-III-31 году, але і на сёньня апошнія ня могуць адказаць, калі гэтыя курсы будуць адкрыты.

Усе вышэйпаданыя факты гавораць аб тым, што заданьне ўраду БССР аб засілаваньні ў гэтым годзе 1 мільёну тон зялёнай масы можа быць ня выканана, калі на гэта ня будзе зараз-жа зьвернута належная ўвага нашых гаспадарчых арганізацый і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Трэба памятаць, што ўраджай сланэчніка з 1 гэктару можа замяніць 5-6 гэктараў выпасу.

Камсамол ВССР па прыкладзе мінулага году павінен быць нашым балавы лёзунг—«камсамол—за сілас»!

А. Даніловіч.

ФАКТЫ аб'ітуюць за СІЛАС

*** Кармавы Інстытут с.-г. Акадэміі Навук імя Леніна абсьледваў вынікі сіласаваньня 1930 году.**

*** Асабліва добрыя вынікі сіласаваньня кармоў атрымаліся ў саўгасе «БРЫЛЁВА», Рагачоўскага раёну (у яме без абліцоўкі), у саўгасе віцебскага ЦРК «НОВЫ СЬВЕТ» (яма цэмэнтная), калгасе «ПРАЦА», Сьмілавіцкага раёну (яма хварасьцяной абліцоўкі), калгасе «ЧЫРВОНЫ МАЯК», Жытнавіцкага раёну (яма з дашчатай абліцоўкай), калгасе «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», Койданаўскага раёну (вежа дрыўляная) і ў радзе іншых саўгасаў і калгасаў БССР.**

*** З 40 дасьледаных па Беларусі аб'ектаў сіласных установак (вежаў — 5, паўвежаў — 1, траншэй і ям — 34) толькі ў трох выпадках сіласаваньня ў неабліцаваных ямах наглядалася неахвотнае паданьне жывёлаю сіласаванага корму.**

У выніку скармліваньня жывёлы сіласам павялічыўся ўдой, сілас выклікаў лепшы апэтыт у жывёлы і г. д.

*** КАЛГАС ІМЯ САЎНАРКОМУ БССР, Вазерскага сельсавету, Менскага раёну, у мінулым годзе засілаваў 150 тон зялёнай масы. Упяршыню быў праведзен вопыт сіласаваньня бульбянога бацьвінья. Вопыт даў дадатнія вынікі. Сілас аказаўся добрым па якасьці і ахвотна паядаецца жывёлай. У гэтым годзе калгас значна павялічвае плян сіласаваньня.**

*** КАЛГАС ІМЯ «КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ», Грышчанскага сельсавету, у 1930 годзе заклаў 2 сіласныя ямы. Сілас удаўся. Калгас высунуў цяпер сустрэчны плян пашырэньня пасеўных плошчы пад сіласныя культуры, які прадугледжвае пашырэньне гэтай плошчы з 20 гэкт. да 150 гэкт.**

*** КАЛГАС ІМЯ АДПУ, Менскага прыгараднага сельсавету, першы ў БССР прыняў цікавы вопыт закладкі пад сілас 80 проц. пубіну і 20 проц. іншых культур. Сілас з пубіну аказаўся вельмі добрым па якасьці; ён мае ў сабе шмат бялкоў. Якасьць мёлага ад карову, якія кармяліся гэтым сілясам нармальная.**

*** Па Самахвалавіцкім раёне калгасы і наогул насельніцтва з недавер'ем адносіліся да сілясу. Засілаваньне ў мінулым годзе 2 тыс. тон паказала беспадстаўнасьць такога недавер'я. Па раёне ня было ніводнага выпадку папсаваньня сілясу.**

*** У КАЛГАСЕ «ЧЫРВОНАЯ ПЛОШЧА», Уваравіцкага раёну, у якім налічваецца 135 галоў малочнай жывёлы, у мінулым годзе дзякуючы энэргіі старшыні калгасу тав. НОВІКАВА выкапалі адну сіласную яму і засілавалі некальні тон. Сілас атрымаўся вельмі добры. Зараз калгасьнікі скарыстоўваюць сілас у якасьці канцэнтраваных кармоў. Адносіны да сілясу з боку калгасьнікаў рэзка зьмяніліся. У сваіх сустрэчных пляках калгасьнікі прапануюць павялічыць пасевы сілясу АМАЛЬ НА 50-100 ПРОЦ. у параўнаньні з кантрольнымі лічбамі, бо ў сіласаваньні яны бачаць адзіны выхад для вырашэньня кармавой праблемы.**

*** У КАЛГАСЕ «РУХАВІК РЭВАЛЮЦЫІ» (Уваравіцкі раён), які мае звыш 500 шт. жывёлы, у мінулым годзе пабудавалі сіласную вежу, у якую заклалі звыш 100 тон сілясу. Сілас атрымаўся вельмі добры. Дзякуючы сілясу, які яны дадавалі да грубых кармоў, калгасьнікі здолелі дагэтуль пратрымаць жывёлу ў добрым стане.**

КАЛГАС «РУХАВІК РЭВАЛЮЦЫІ» высунуў сустрэчны плян сіласаваньня і пастанавіў засілаваць 500 ТОН СІЛАСУ, што складае палову патрэбных калгасу на год кармоў.

Як будаваць сіласную яму

Сіласныя ямы і траншэі ў залежнасьці ад шчыльнасьці грунту падзяляюцца на наступныя тыпы:

а) ямы ў шчыльных гліняных грунтах з частковай абліцоўкай,

б) траншэі ў шчыльных гліністых грунтах без абліцоўкі,

в) ямы і траншэі ў слабых грунтах з суцэльнай абліцоўкай, якая забясьпечвае ад асыпаньня сьцены і прасяканьня сіласных сокаў у грунт і з грунту ў сілас.

Форма ямы павінна быць круглай, сьцены зусім адвесныя і гладкія для таго, каб сіласная маса лепш асядала.

Траншэі робяцца з нахіленымі сьценкамі, бо доўгую траншэю з адвеснымі сьценкамі, нават у шчыльным грунце, рабіць небясьпечна (можа быць абвал сьцен), вугры траншэі трэба закругляць.

Ухіл сьцен траншэі трэба рабіць у залежнасьці ад шчыльнасьці грунту. Калі грунт, напрыклад, шчыльны (гліністы), можна траншэю капаць зьверху шырынёй у 3,75, зьнізу ў 2,5 мэтра, пры глыбіні 2,5 мэтра, і даўжынёй—ня больш 30 мэтраў.

Пажадана, каб сьцены ям і траншэй пры шчыльных гліністых грунтах абліцоўваліся на ½ зьверху. Абліцоўка можа быць з дошак, або пласьцін. Пры драўлянай абліцоўцы з дошак апошняя робіцца круглай формы, а з пласьцін—васьмігранная формы. Неабліцаваная частка ямы застаецца круглай.

У шчыльных і слабых грунтах ямы і траншэі трэба абліцоўваць плетнем або пэглай. У якасьці матар'яла для плетня могуць быць ужыты хваст, лаза і інш. мясцовыя аднаводныя матар'яны.

Паміж грунтам і плетнем забясьпечыць пласт тлустай гліны таўшчынёю ня менш 20 сантыметраў у залежнасьці ад вільготнасьці грунту.

У нутраным баку плетня абмазваюцца глінай і добра запраўляцца. Цагляная абліцоўка робіцца ў адну цагліну на гліняным растворы, або ў поўцагліны на зьмешаным растворы (адна частка цэменту, 2 часткі вапны і 12 частак пяску). Пры кладцы ў адну цагліну, апошняя абавязкова павінна ўкладацца тычкамі.

У абодвых выпадках швы паміж цэглямі павінны перакрывацца наступнымі радамі цэглы. Цяпляныя сьценкі пад вінны пасьля кладкі пыстаяцца, калі кладка робіцца на зьмешаным растворы ня менш 28 дзён, а пры кладцы на гліне—каля 14 дзён, у залежнасьці ад надвор'я.

Паміж грунтам і сьценкай ямы забівае ца пласт гліны таўшчынёю 30 сантыметраў, а сьценкі з сярэдзіны запраўляцца глінай.

Пры пабудове траншэй з нахіленымі сьценкамі ў шчыльных гліністых грунтах абліцоўка сьцен на робіцца, а зьверху, каб сьцены не асыпаліся, кладзецца два вянкі з бярвеньняў. Пры абліцоўцы ям і траншэй у слабых грунтах зверасным плетнем, трэба сачыць, каб плетень быў прамазан і прасякнут глінай.

У слабых грунтах дно ям і траншэй насьцілаецца тлустай, густа ўтрамбаванай глінай таўшчынёй ня менш 20 сантымэтраў, з ухілам у сярэдзіну, дае робіцца паглыбленьні каля 60 сантымэтраў. У траншэях робіцца некалькі такіх паглыбленьняў.

Ямы і траншэі павінны будавацца каля хлявоў, але ў поўнай адлегласьці ад жыжкапрымеркаў. Месцазнаходжаньне іх па магчымасьці павінна быць на ўзгорку з натуральным сьцёкам дажджавых вод.

Трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на тое, каб дно ямы ці траншэі было вышэй узроўню грунтавых веснавых вод ня менш, як на ½ мэтра. Глыбіня ямы ці траншэі павінна быць ня менш 2 мэтраў і шырыня таксама ня менш 2 мэтраў.

Там, дзе грунт сухі, ямы і траншэі можна капаць шырынёю ў 3 мэтры, а глыбінёю да 4½ мэтраў. Памеры ям і траншэй, а таксама і ліп іх залежыць ад колькасьці патрэбнага для загатоўкі корму, прымаючы пад увагу, што на кожную карову патрэбна ў год (195 кармавых дзён) каля 3.000 кг. (3 тоны), або 6 кубамэтраў.

Сіласныя ямы і траншэі загружаюцца сіласнай масай з верхам.

Праз дзень-два, калі апошняя пагрэцца, утрамбоўваецца і загружаецца зноў з верхам, пасьля трамбуецца і закрываецца на зіму.

Для зімовага пакрыцьця сілясу на масу пакідаецца пласт саломенай сечкі, мякіны і сухіх лісьцяў, добра змочаных вадой, потым пакрываецца пластом тлустай мятай гліны, напрыклад, сант. 25-30, а зьверху пакідаецца зямля пластом у 75 сантымэтраў.

Накрыўка робіцца ў выглядзе скляпеньня, краі яе павінны перакрывацца краі ямы па адзін мэтр. траншэі—на 0,95—0,75 мэтр. Вакол ямы ці траншэі на адлегласьці прыкладна ½ мэтра ад краёў засыпкі трэба рабіць адводныя канаўкі для сьнегавой і дажджавой вады. Каб захаваць сілас ад дажджу, робіцца звычайны шалаш.

Арыентовачная патрэбнасьць рабсілы і матар'яла для пабудовы сіласнай ямы са сьцякой з плеценю ёмістасьцю 30 кубамэтраў (глыбіня 4,25, дыямэтр 3): 42 чалавекадні, гліны 32,9 куб. м., пяску 0,86 к. м., хвасту 1.72 і жардзе 0,79.

Для траншэі ёмістасьцю ў 360 к. м. пры глыбіні 4 мэтры, пры даўжыні 30 мэт.—435 чалавекадзён, гліны 205 к. м., пяску 5,50 хвасту 11,7—і жардзе 32.

КАЗЛОЎ,
інж. Белсельсаюзу.

ШТО АЗНАЧАЕ:

„ЗА ЦІ СУПРОЦЬ КАЛГАСУ“

3. Нэйтральным быць нельга

Ці можна быць нэйтральным зараз у гэтых гістарычных абставінах, калі шматмільённыя масы беднякоў і серадняко, перакананўшыся ва ўсіх перавагах калгасаў, усталі на калгасны шлях і калі кулацтва—асноўны і зьлейшы вораг калгасаў, ліквідуецца, як кляса? Кожнаму бедняку і серадняку—аднаасобніку павінна быць вусім ясна, што нэйтральным у гэтай жорсткай класавай барацьбе нельга заставацца. Вось чаму перад кожным бедняком і серадняком, ня ўступіўшым у калгас, паўстала асноўнае пытаньне—**за ці супроць калгасу.**

Сярэдзіны быць ня можа. Ці дапамога ў будаўніцтве калгасаў, падтрыманьне калгаснага руху, рашучая барацьба з кулаком, што робяць мільёны бедняцка-серадняцкіх мас, ці барацьба супроць калгасаў, супроць калгаснага будаўніцтва—што робіць кулацтва. І вусім ясна, што той бядняк і серадняк-аднаасобнік, які дапамагае кулаку змагацца супроць калгасаў і падрываць калгаснае будаўніцтва, ня можа быць названы саюзьнікам і тым больш апорай рабочай клясы —ён на справе саюзьнік кулака—зьлейшага ворага калгасу і савецкай улады, бо «за калгас, за падтрыманьне калгаснага руху—азначае падтрыманьне савецкай улады і рашучую барацьбу з кулаком. Супроць калгасу, супроць падтрыманьня калгаснага руху азначае дапамога кулаку супроць савецкай улады. Сярэдзіна сьціраецца, нэйтральным у гэтай справе ўжо нельга заставацца. У гэтым годзе пытаньне аб адносінах да калгасу рубам пастаўлена перад кожным бедняком і серадняком. Застаецца выбіраць» (Молатаў).

Выбар прыпадае па калгасны шлях бо «дробным гаспадаркам з галечы на вышысьці», бо «калі мы будзем сядзець па-старому ў дробных гаспадарках, хапя і вольныя грамадзяне на вольнай зямлі, нам усё роўна пагражае пяміучая пагібель» (Ленін).

Гэты выбар, выбраўшы калгасны шлях, паказаны партыяй і савецкай уладай, зрабілі ўжо дзесяць мільёнаў сялянскіх гаспадарак, перакананўшыся ў правільнасьці гэтага шляху і «ня з кніг і тэзырытычных разважаньняў, а на ўласным вопыце» (зьезд). Выбіраць гэты шлях штодня новыя дзесяткі і сотні тысяч бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, каб стаць сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады.

А для таго, каб стаць гэтай сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады перад бядняком і серадняком—аднаасобнікам, адзін шлях — шлях дапамогі калгасам, а потым уступленьня ў калгасы, пад калгасны сьцяг. Новыя мільёны бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ужо вырашылі для сябе гэта пытаньне—ісьці а рабочымі за калгасы супроць кулака.

Ці можна ў сувязі з гэтым у якой-небудзь ступені асабліць арганізацыйную і растлумачальную работу сярод аднаасобнікаў, апіраючыся на самацёк. Гэта была-б шкоднейшая пазыцыя. Задача ўся заключаецца ў тым, каб штодзенна і пастойліва і цярпліва весьці гэтую растлумачальную работу, накіраваную да таго, каб перакінаць масы стаць на шлях калектывізацыі. Ленінскі прынцып добраахвотнага ўступленьня ў калгас застаецца непахісным прынцыпам нашай партыі і савецкай улады, але толькі апартуністы могуць адмовіцца ад арганізацыйнай і растлумачальнай работы ў масах, спадзяючыся на самацёк. Стаўка на самацёк чужая нашай партыі і з ёю трэба рашуча змагацца. Усе перашкоды, якія стаяць на шляху завяршэньня суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, павінны быць намі зьмецены. Галоўная небясьпека, такім чынам, заключаецца ва ўсіх тых перашкодах, якія тармозяць хутчэйшае ажыцьцяўленьне вызначаных тэмпаў калектывізацыі. Вось чаму правы ўхіл, які адлюстроўвае кулацкую небясьпеку ў краіне, ёсьць, застаецца галоўнай небясьпекай. Сюды—галоўны агонь.

Мы павінны ў той-жа час наносіць руйнуючыя ўдары і па «левых» ухілістах, якія забягаюць наперад, думаюць адным махам зьнішчыць усе труднасьці, ліквідаваць іх чохам, перасякочыць праз іх. Нима чаго гаварыць і аб тым, што такія работнікі ствараюць нам толькі дадатковыя штучныя труднасьці, якія выкарыстоўвае кулак і правы апартуніст. «Левыя» загібшчыкі не ад таго, каб кінуць у скрынку пярлівую растлумачальную работу ў масах аднаасобнікаў і заняцца адміністраваньнем, камандаваньнем. Зусім ясна кожнаму, што гэта пярэчыць усёй сутнасьці нашай бальшавіцкай партыйнай палітыкі, палітыкі нашай сувязі з шматмільённай масай сялянства. Ёсьць факты, калі асноўнае пытаньне, пастаўленае перад кожным бедняком і серадняком—за ці супроць калгасу—некаторыя работнікі прабуюць вырашыць вельмі проста. Зараз-жа залічваюць усіх бедняко ў і серадняко ў, якія ня ўступілі яшчэ ў калгас, у саюзьнікі кулака, на некаторых сходах галасуюць:—хто за савецкую ўладу і хто супроць савецкай улады. З Татары паведамляюць, што ў Бугульвінскім і Гумуцкім раёнах ёсьць выпадкі, калі работнікі падаяляюць аркуш паперы на двое: адна палова «за калгасы супроць кулака», а другая палова «за калгасы супроць кулака». З такімі аркушамі мясцовыя работнікі ходзяць па дварох і запісваюць, награжаючы наступуючым раскулачваньнем і абкладаньнем непасільнымі падаткамі. У радзе раёнаў мясцовыя работнікі адмаўляюцца ад работы з беднатой, ад арганізацыі бядняцка-батрацкіх груп, лічачы ўсё гэта ўжо пройдзеным этапам, лішнім, не разумеючы таго, што ў раёне з слаба развітай калектывізацыяй неабходна асабліва намагны на арганізацыю беднаты, каб бядняк-аднаасобнік першым устаў на шлях дапамогі калгасам, а потым і ўступленьня ў яго, упяршыню за сабой серадняка. Няма чаго гаварыць аб тым, што такая палітыка нічога агульнага ня мае з ленінскай лініяй нашай партыі ў справе калектывізацыі. Кожны камуніст, кожны калгасьнік, кожны вясковы актывіст павінен сабе усьвядоміць, што саюзьнікам кулака зьяўляецца той бядняк і серадняк—аднаасобнік, хто дапамагае кулаку змагацца з калгасамі, хто дапамагае кулаку падрываць калгаснае будаўніцтва. Той-жа бядняк і серадняк—аднаасобнік, хто разам з рабочай клясай дапамагае будаваць калгасы, хто падтрымлівае калгасны рух, хто дапамагае весьці рашучую барацьбу з кулаком,—**заставацца саюзьнікам рабочай клясы і пераўтвараецца ў сапраўдную і моцную апору, калі ён становіцца на шлях дапамогі калгасам, а потым і ўступленьня ў калгасы.**

Так стаіць пытаньне. Значыцца, рашаючая задача, у асабліваści на ўсіх раёнах з нізкім узроўнем калектывізацыі, у спажывацкай паласе, у адсталых нацыянальных раёнах, заключаецца ў тым, **каб бядняк і серадняк—аднаасобнік ня быў-бы нэйтральным, каб ён выразна выявіў свае адносіны да калгасу, да калгаснага будаўніцтва, уключыўшыся ў разгорнутае наступленьне на капіталістычныя элементы.** Толькі пры гэтай умове мы здолеем да канца ліквідаваць завяршыць ў асноўным калектывізацыю Савецкага Саюзу і ахапіць ужо ў 1931 г. ня менш 50 проц. сялянскіх гаспадарак па СССР.

У рэзультаце шырокага растлумачэньня бядняцка-серадняцкім масам значэньня пытаньня «за ці супроць калгасу» мы павінны дабіцца таго, каб кулацтва было канчаткова ізалявана, каб яго шалёнае супраціўленьне было зломлена ў адкрытым баю, каб яно было ліквідавана на базе разгорнутай суцэльнай калектывізацыі, каб ўсе бядняцка-серадняцкія масы, яшчэ не ўвайшоўшыя пакуль у калгасы, сказалі-б—МЫ З

БАЯВАЯ ПРАГРАМА ЛЕСБЕЛУ—

сплавіць 6 мільёнаў кбм. лесаматар'ялу,

да пачатку навігацыі вывезьці да прыстаняй увесь загатоўлены лес

Дагэтуль вывезена толькі 34 проц. пляну.—Такелаж не падрыхтаваны.—Рабочай сілы не хапае

Пераключыць лесазагатоўчы апарат на ўдарныя тэмпы работы!—Ачысьціць вучасткі ад апартуністаў, якія зрываюць загатоўкі

Лесбел да сплаву не падрыхтаваны

Праз некалькі дзён пачнецца навігацыя, а за ёй і лесасплаў. Сплаў у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі зьяўляецца вельмі важнай гаспадарча-палітычнай кампаніяй. Праграма сплаву 1931 году павялічана на 75 проц. супроць леташняй. 6 мільёнаў кбм. драўніны павінны быць сплаўлены па рэках БССР, 85 проц. сплаву—матар'ял для будаўніцтва, капалень і прадпрыемстваў.

Такая праграма патрабуе вялізарнейшай адказнасьці за свячасовую падрыхтоўку.

Першы квартал скончыўся. Можна канстатаваць, што праграма лесазагатовак і вывазкі ня выканана. На 20-га сакавіка вывезена да чыгункі і прыстаняй 59 проц. загатоўлена будаўнічага матар'ялу і 57 проц. дроў.

Нізкі процант выкананьня пляну вывазкі да чыгункі—усяго 800.000 кбм. за ўвесь квартал,—пагражае нармальнай рабоце дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў.

Для лепшага забесьпячэньня сплаву Лесбел выпучыў спэцыяльны сэктар, на які ўскладзена адказнасьць за правядзеньне кампаніі. У гэтым годзе створаны таксама 4 сплаўныя канторы, якія ахапляюць усе басэйны рэк БССР. Здавалася-б, гэтыя мерапрыемствы павінны дапамагчы лепшай падрыхтоўцы да сплаву. На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што сэктар сплаву Лесбелу не спраўляецца са сваімі задачамі. У сэктары няма нават прамфінпляну сплаву 1931 году. Работнікі сэктару разводзяць рукамі—бачыце, месцы не даюць матар'ялу; але яны самі на прымаюць ніякіх мер, каб пасюрыць атрыманьне вестак.

Дрэнна праходзіць вывазка загатоўленага лесаматар'ялу да прыстаняй. На 23-га сакавіка да ўсіх прыстаняй вывезена 34 проц. пляну. Па Бабруйскай сплаўнай канторы, якая ахапляе басэйн Бярэзіны, дзе праграма сплаву складае 40 проц. усяго пляну Лесбелу, праграма выканана толькі на 29 проц.

Вялікае значэньне набывае зімовая вязка плытоў.

Саюзлеспром устанавіў праграму зімовай вязкі плытоў у 700 тысяч кбм. Лесбел разьвярстаў гэта заданьне па леспрамгасах, але выканана пакуль толькі 2-3 проц. заданьня.

Такую работу нельга інакш кваліфікаваць, як праяўленьнем праваапартуністычнай недаацэнкі сплаўнай кампаніі.

Дрэнна праходзіць загатоўка такопажу і гужбы. На 23-га сакавіка загатоўлена толькі 25 проц. праграмы па гужбе, між тым, паводле пляну, да пачатку навігацыі 60 проц. патрэбнай гужбы павінна быць ужо на прыстанях.

У пагражаючым становішчы загатоўка дроту, якароў. Толькі ў апошнія дні паступіла некаторая колькасьць інвэнтару.

Для выкананьня праграмы неабходна 40 тысяч чалавек, з якіх 65 проц. кваліфікаваных плытагонаў. Кадравы аддзел Лесбелу праводзіць вярбоўку вельмі дрэнна. Да 25-га сакавіка на ўсіх вучастках, замест 40 тысяч чал., завербавана толькі 7.500.

Трэба дэтальна абсьледаваць работу аддзелу кадраў Лесбелу.

Я. Ф.

Камсамольскі суботнік ліквідацыі прарываў

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Плян вывазкі лесу па СТАРАСЕЛЬСКІМ сельсавеце выкананы толькі на 36 проц., 6.000 кбм. дроў дагэтуль ня вывезены з лесу. Кіраўнікі леспрамгасу спасылаюцца на розныя «аб'ектыўныя прычыны», але сапраўдная прычына — няздольнасьць кіраваць лесазагатоўкамі, бязладныя адносіны да даручаных абавязкаў.

Кожная кулацка-заможная гаспадарка павінна была за ўвесь час кампаніі вывесьці 50 кбм. дроў; бядняцкім гаспадаркам дано заданьне вывезьці 35 кбм. Гэты факт сьведчыць аб скажэньні клясавай лініі, аб дачы кулацка-заможным гаспадаркам зьменшаных заданьняў (многія кулацкія гаспадарні выканалі зданьне за 10 дзён). Няма кантролю за выездам сялян у лес. Некаторыя дзесятнікі давалі пасьведчаньні сялянам аб выкананьні імі заданьняў, у той час, калі яны нават не выяжджалі ў лес. Каапсаюз не забясьпечвае коняй аўсом.

Камсамольская арганізацыя, улічваючы дрэннае становішча загатовак, правяла суботнік ліквідацыі прарываў; вывезена шмат лесу. Асабліва добрую работу паказалі камсамольцы калгасу імя 1-га мая і прафшколы.

А. З.

Рукэ школьніка дзейнічае

МАЗЫР. (НАШ КАР.). МАЗЫРСКАЯ СПЛАЎНАЯ КАНТОРА АТРЫМАЛА НАРАД НА БОТЫ ДЛЯ ПЛЫТАГОНАЎ. ТЭРМІНОВА ПАСЛАЛІ ФУРМАНКІ НА СТАНЦЫЮ.

АЛЕ ЗАМЕСТ БОТАЎ ДЛЯ ПЛЫТАГОНАЎ, СПЛАЎНАЯ КАНТОРА АТРЫМАЛА 1.575 ПАР АБУТКУ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ 11-12 ГАДОВАГА ЎЗРОСТУ.

НЕВЧАЯ ШКОЛЬНІЦКАЯ РУКА ЗРЫВАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ РАБОЧЫХ.

ПРОСІМ «ЗВЯЗДУ» АСЬВЯТЛІЦЬ ГЭТУЮ СПРАВУ І ПРЫЦЯГНУЦЬ КАГО ТРЭБА ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

ЭЙДЭЛЬМАН.

Сыгналы з лесу

(Агляд лістоў рабселькораў)

Сплаўны сэзон набліжаецца. Праз некалькі дзён пачнецца бездарожжа. Таму вывазка лесу набывае зараз вырашальнае значэньне. Нельга дапусьціць, каб загатоўленыя матар'ялы засталіся ў лесе. Між тым, на радзе лесавучасткаў становішча з вывазкай лесу далёка пездавальняючае. Аб гэтым сьведчаць лісты рабселькораў з розных раёнаў і вёсак БССР.

Тав. **В. Шымакоўскі** адзначае, што Мсьціскі вучастак стаіць на апошнім месцы ў Бягомльскім раёне. Ён загатовіў 67,3 проц. заданьня па лесаматар'ялах і вывез 41 проц., загатовіў 13,8 проц. пляну па дровах і вывез 19,8 проц.

Мсьціскі вучлесспрамгас злачынна зрывае лесавывазку; шкодзікі, якія тармозяць выкананьне заданьня, павінны быць выгнаны з лесазагатоўчага апарату.

***

Тав. **Мацьвяёнак** з Чашніцкага раёну паведамляе, што ў Іванскім сельсавеце правы апартунізм зьвіў сабе трывалае гняздо. З верасьня па сакавік не праводзілася ніякай работы па загатоўках. Сакратар ячэйкі **Старыковіч** лічыў, што пляны загатовак няжыцьцёвыя і гэтны погляд пашыраў сярод членаў ячэйкі і сялян. Апрача сумных хіканьняў і разважаньняў, ніякіх паказаньняў ён не даваў. Пад дудку Старыковіча скача старшыня сельсавету **Падрэз**. Таксама і ў яго — нуднае ныцьцё аб труднасьцях работы, яўныя сымпатыі да кулацка-заможнай часткі. Досыць сказаць, што на буйным сельсавеце ў 900 двароў ня выяўлена ні воднага кулака. Зараз сакратар ячэйкі зьняты з работы, але старшыня сельсавету сваю лінію праводзіць і надалей. Ніякай работы з беднатой не вядзецца.

Вывазка лесу ідзе нездавальняюча

Баявое заданьне лесазагатоўчым арганізацыям БССР—сплавіць па рэках каля 6 міл. кбм. лесу.

Як падрыхтаваны Лесбел да сплаву?

Паводле вестак Лесбелу, па 20-га сакавіка вывезена да сплаўных прыстаняй каля 2 мільёнаў кбм. лесаматар'ялу і дроў.

Асабліва дрэнна выканалі плян вывазкі будаўнічай драўніны Боркавіцкі леспрамгас (28,9 проц.). Быхаўскі (31,2 проц.).

Па вывазцы дроў адстаюць Лепельскі раён (21,8 проц. заданьня), Глускі (25,2 проц.).

Унерадзе ідзе Віцебскі леспрамгас, які вывез 96 проц. заданьня па будаўнічых матар'ялах і 103 проц.—па дровах.

МЕНСК

Нарада рэдактароў цэнтральных і раённых газэт БССР

На працягу 2-х дзён—31-га сакавіка і 1-га красавіка—працавала склікапая Культпропам ЦК КП(б)Б нарада рэдактароў цэнтральных і 15-ці раённых газэт па пытаньнях, зьвязаных з падрыхтоўкай і правядзеньнем другой бальшавіцкай вясны. На нарадзе з прамовамі выступілі: сакратар ЦК КП(б)Б тав. **ГЕЙ**, народны камісар забесьпячэньня—тав. **БАЛЦІН**, старшыня Калгасцэнтру — тав. **МІЦЬКОЎ** і намесьнік наркома земляробства — тав. **МАСЮКОЎ**.

Нарада заслухала паведамленьне рэдактара газэты «Зьвязда»—тав. **БУДЗІНСКАГА** аб усебеларускай генэральнай праверцы падрыхтаванасьці БССР да сяўбы і даклад намесьніка загадчыка Арг. Адд. ЦК КП(б)Б—тав. **СУДАКОВА** аб перабудове партыйнай работы на вёсцы і задачах друку. Пасьля абгаварэньня накладу прадстаўніка Культпропу ЦК аб усебеларускім аглядзе - самаправерцы становішча пізавога друку, рабселькораўскага руху і партыйным кіраўніцтве ім—нарада закрылася.

Рэарганізацыя структуры БАН

На пасяджэньні прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук было разгледжана пытаньне аб структуры БАН. У мэтах канцэнтрацыі вакол Акадэміі навукова-дасьледчай працы, якая праводзіцца ў БССР, максымальнага набліжэньня гэтай працы да задач сучаснага сацыялістычнага будаўніцтва, прэзыдыум БАН пастанавіў рэарганізаваць структуру Акадэміі. Арганізуюцца новыя навукова-дасьледчыя інстытуты Акадэміі: мовазнаўства, літаратуразнаўства і мастацтва, савецкага будаўніцтва і права, эканомікі, біялёгічных навук, хэміка-тэхналёгічны, фізіка-тэхнічны. Распрацоўваецца таксама пытаньне аб арганізацыі інстытуту камуністычнага выхаваньня і паводзін чалавека. Прэзыдыум прызнаў неабходным тэрмінова склікаць нарады ўсіх навуковых работнікаў, што працуюць у розных навукова-дасьледчых медычных установах па пытаньні аб арганізацыі пры Акадэміі адзінага медычнага інстытуту.

Замест існаваўшых раней катэдры гісторыі Літвы і камісіі па вывучэньні жыцьця і працы латышоў, прэзыдыум рэарганізаваў іх у адпаведныя сэктары. Такім чынам, пры БАН разам з яўрэйскім і польскім сэктарамі будуць працаваць латыскі і літоўскі нацсэктары.

Акрамя гэтых інстытутаў і нацсэктароў, у структуры Акадэміі ўключаецца інстытут асьпірантуры БАН, выдавецтва Акадэміі і бібліятэка.

У мэтах папулярызацыі ў масах навейшых дасягненьняў навукі і тэхнікі, прэзыдыум пастанавіў выпускаць пэрыядычна масавую навукова-папулярную часопісь «Навука і тэхніка ў масы».

Камсамол у авангардзе разгорнутага наступленьня на бюрократызм

НОВЫЯ ФОРМЫ РАБОТЫ ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ. 2-га КРАСАВІКА НА ЗЬЛЕЦЕ ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ МЕНСКУ, КАМІСІЯ ЦКК-РСІ РАЗАМ З КАМСАМОЛЬЦАМІ ДРУКАРНІ ІМЯ СТАЛІ НА БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЬ ЧЫСТКУ АПАРАТУ ДЗЯРЖПЛЯНУ

2-га красавіка ў 6 з пал. гадзін вечара ў памяшканьні клюбу імя К. Маркса адбудзецца зьлёт усёй лёгкай кавалерыі гор. Менску сумесна з работнікамі Дзяржпляну і работнікамі савецкіх установ па кантролі за выкананьнем і рацыяналізацыяй апарату. НА ГЭТЫМ ЗЬЛЁЦЕ БУДЗЕ ПРАХОДЗІЦЬ ЧЫСТКА РАБОТНІКАЎ ДЗЯРЖПЛЯНУ — СВАТКО, ТУРЭЦКАГА, ЗАЛЕСКАГА, ФЭДАРЭНЧЫКА, ВІНАВАТЫХ У ЗРЫВЕ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ ПА ПАСТАНОЎЦЫ КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАНЬНЕМ, РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ АПАРАТУ І РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ КАДРАЎ. Чыстку будзе праводзіць камісія ЦКК СУМЕСНА З АТРАДАМ ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ ДРУКАРНІ ІМЯ СТАЛІНА ЯКІ САМАСТОЯНА ПРАВЕРЫЎ РАБОТУ ДЗЯРЖПЛЯНУ ПА УПАМЯНУТЫХ ПЫТАНЬНЯХ.

У выніку дадатніх рэзультатаў гэтага новага вопыту ўдзелу камсамолу ў чыстцы апарату і барацьбе з бюракратызмам, ЦКК-РСІ ВЫСУНУЛА ПЕРАД КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ БЕЛАРУСІ ІДЭЮ ЎЗЯЦЬЦЯ ШЭФСТВА НАД ПАСТАНОЎКАЙ КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАНЬНЕМ ВА ЎСІХ САВЕЦКІХ УСТАНОВАХ. Прыняцьце шэфства адбудзецца на гэтым-жа зьлёце.

Дзень 2 з красавіка абвешчан УДАРНЫМ ДНЁМ БАРАЦЬБЫ КАМСАМОЛУ З БЮРАКРАТЫЗМАМ. На ўсіх прадпрыемствах адбудуцца мітынгі аб ролі камсамолу ў барацьбе з бюракратызмам і вопыце чысткі Дзяржпляну сіламі камсамолу.

Надаючы гэтай справе сур'ёзнае палітычнае значэньне, ЦКК РСІ і камсамольскія арганізацыі запрашаюць прадстаўнікоў друку, прафсаюзаў, кіраўнікоў шэфскіх брыгад работнікаў савецкіх установ па кантролі за выкананьнем і рацыяналізацыяй савецкага апарату на гэты зьлёт.

В.

16 буксірных брыгад ЦСПСБ—на прадпрыемствы

Для ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну на больш адстаючых прадпрыемствах БССР, а таксама і на чыгунцы, прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў скласьці 16 БУКСІРНЫХ БРЫГАД з прадстаўнікоў ЦСПСБ, ЦП саюзаў, ВСНГБ і ЛКСМБ. Брыгады накіроўваюцца на тэрмін ня менш двух тыдняў на наступныя прадпрыемствы: завод «Спартак», «Герой працы», «Чырвоная зорка», віцебскую швэйную фабрыку, менскую швэйную фабрыку імя 8-га сакавіка, віцебскую гарбарню, ф-кі «Вэзувій», «Дзьвіна», «Дняпроўская мануфактура», акулярную фабрыку, бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, барысаўскі лесапільны завод, жлобінскі і гомельскі вузлы (чыгунка).

***

Тав. **Т. С.** з Капаткевіцкага раёну ў сваёй заметцы сыгналізуе, што з-за галавацяпства мясцовых работнікаў, лесазагатоўкі праходзяць вельмі дрэнна. Дровы, якія восьнёю 1930 году плылі па р. Ніч, не дайшлі да месца прызначэньня, іх выцягнулі на ніякі бераг, лесаматар'ял траціў пад лёд і замёр. Зараз яго возяць на станцыю, высякаючы з-пад ільду, што значна ўдаражае сабекошт загатовак.

Тав. **«Адзінокі»** адзначае, што ў Чэрыкаўскім і Клімавіцкім леспрамгасах падрыхтоўка да сплаву амаль не разгорнута. Няма гужбы, не загатоўлена рабочая сіла, нічога не робіцца для мэханізацыі работ. Пры такіх тэмпах падрыхтоўкі сплаў нямінуча сарвецца.

***

Тав. **Лапіцкі** дае ў сваёй заметцы характарыстыку загатовак па Друцкім леспрамгасе. Сацспаборніцтва ў лесе да апошняга часу на было разгорнута. Ня былі арганізаваны ўдарныя брыгады лесарубаў. Мелі месца выпадкі разбазарваньня прамтавару. У выніку заданьне па вывазцы лесу на было выканана. Зараз вучастак пераключыўся на ўдарныя тэмпы. Зьняты з работы загадчык і два дзесятнікі. Праведены нарады па цьвёрдых заданьнях, створаны ўдарныя брыгады па вучастках.

На сёньняшні дзень крывая загатовак бесьперапынна паўзе ўгару.

Тав. **З. Ераменка** паведамляе, што ў Рагінскім сельсавеце плян лесазагатовак выканан толькі на 4 проц. Кулакі ўсім ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Ні адна кулацкая гаспадарка не апітрафавана. Тав. Ераменка патрабуе прыцягненьня да адказнасьці апартуністаў, якія зрываюць загатоўкі.

ЖАКТ ня рыхтуецца да паводкі

Праўленьне ЖАКТ'у № 8 ўсім ня рыхтуецца да барацьбы з паводкай. У дамах ЖАКТ'у сьнег ляжыць ня толькі на тратуарах, але і ва дварох. Валасьцёкі завалены. Пры найменшым пацяпленьні вада цячэ ў кватэры. Жыхары сутарэньняў і паўсутарэньняў пад пагрозай затапленьня. Праўленьне ЖАКТ'у ўсім ня цікавіцца гэтай справай.

Асабліва дрэннае становішча ў доме № 48 на вул. Энгельса.

— ЦП саюзу транспартнікаў пастанавіла перадаць рабочых грузчыкаў у саюз чыгуначнікаў. Перадаецца кала 2.000 рабочых.

— 12-га красавіка пры ЦВК адбудзецца пленум цэнтральнага бытавога камітэту. На паравку дня: аб рабоце з жанчынамі—членамі савету, аб забесьпячэньні ў 1931 годзе прадуктамі і вопытакай дзіцячых ясляй і садоў, інфармацыі Койдапаўскага, Заслаўскага і Сьмілавіцкага раёнаў аб іх падрыхтоўцы да адкрыцьця дзіцячых устаноў і інш.

Работніца-вылучэнка т. Марусевіч—наркам-сабес БССР

Тав. **МАРУСЕВІЧ Е. К.** нарадзілася ў 1899 годзе ў Віленскай губ. 16 год паступае на фабрыку «Дзьвіна» (Віцебск), дзе працуе аж да 1929 году. Апошнія тры гады тав. Марусевіч працавала старшынёй ЦП саюзу тэкстыльшчыкаў.

Тав. Марусевіч зьяўляецца членам ЦК КП(б)Б, членам ЦВК і кандыдатам у члены прэзыдыуму ЦВК БССР.

На раённых зьездах спажывецкай кааперацыі

Прывітаньне ЦК КП(б)Б

1-шы зьезд спажывецкай кааперацыі Копыскага раёну шле шчырае прывітаньне баявому штабу сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР — Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б. Зьезд запэўнае ЦК, што ўсе задачы, якія ставіць партыя перад спажывецкай кааперацыяй, будуць поўнасьцю выкананы. Студзеньскі пленум ЦК зусім правільна ацаніў работу спажывецкай кааперацыі і вызначыў шляхі ліквідацыі прарываў на гэтым фронце. Мы мабілізуем увесь актыў, шырокія колы беднаты, батрацтва і калгасьнікаў на ліквідацыю прарываў. Няхай жыве ленінская партыя і яе верны кіраўнік — ЦК КП(б)Б.

***

НАРОЎЛЯ. (Наш кар.). Скончылася рэарганізацыя раённага спажывецкага т-ва. Усяго на мясцох арганізавана 19 сельскіх спажывецкіх т-ваў. Для кіраўніцтва работай сельскіх т-ваў мабілізавана 15 проц. партыйнага актыву.

ЗОРКІ.

МОПР'ауская газэта, прысьвечаная дню першага мая

Да першага мая ЦК МОПР'у БССР, сумесна з беларускімі пісьменьнікамі выдае друкаваную газэту, прысьвечаную міжнароднаму дню пралетарскай салідарнасьці.

Увесь прыбытак ад распаўсюджаньня газэты пойдзе на нарысьць зарубежных барацьбітоў рэвалюцыі.

Паведамленьні

— ПК ЦКК просіць ніжэйпамянёныя таварышоў зьявіцца на пасяджэньне Парттройкі ЦКК КП(б)Б., якое адбудзецца 4-IV-31 г., а 6½ гадз. вечара ў памяшканьні ЦКК КП(б)Б (Савецкая 55, 3-ці паверх, 18 пакой) Райцеса В. С., Казеля А. Ф., Тоўстага Ф. Вазьнячука М. Ф., Рубенчыка П. Г., Цыпліна Н. П., Кірылова П. Я., Віхнэса Б. Б., Дзятко Р. Д., Зэльцэр Е. І., Нісенбаума Я. М. (Плешчаніцкі раён), Ражанскага А. Р., Шэваха Ф. Я., Столаца І. Э., Кіковіча Я. Д., Кейна Ў. В., Пішчоса М. І., Дубавіка С. М. (Вуздзенскі раён), Хэйфеца В., Махнача В. К., (Вуздзенскі раён), Чыжыка С. М. (Чэрвеньскі раён), Бэрэіна (КП(б)Б Белшвэйтресту), Гольдвасэра Е. Л., Грынгауза А. Я. Пука абавязкова. Пажадана прысутнасьць сакратароў ячэек, на вучоце якіх лічацца выкліканыя таварышы.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр бішнеуск
СЕНЬНЯ адкрыты спэктакль „ПЕРШАЯ КОНЦАЛ"
Пачатак у 8 гадз. вечі.

Гукавы кіно-тэатр „БЕЛЕСКАЙ ЗОРКА"
НЕ ХАЧУ ДЗІЦЯЦІ.
Кіно-хроніка Саюзкіно № 11.
Пачат.: 7 гадз. 8 г. 45 м. 10 г. 30 м.
КАСА—з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура"
УЗДУВАЙЦЕ ГОРНЫ.
Кіно-хроніка Саюзкіно № 10.
Пачатак: 7 г. 8 г. 45 м. 10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал"
Заменены фільм
ТРЫ ДЖЭГІ
Зьвыш праграмы—хроніка Саюзкіно
Пачатак 1-га сэансу у 4 гадз.
Каса з 4 г. 30 м.

Кіно „Радзіваны"
Сярозь сьлёзы
(Старонка мінулага)
Пач. 1 сэансу ў 6 г. Каса—з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр"
Шкавы фільм АБРЭК ЗДУР.
Кіно-навесьць у 10 частках.
Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня.
Каса—з 11 г. 30 м.

КІНО „Спартак"
2-гі тыдзень 2-гі
ТАРАС ТРАСІЛА трагедыя ў 7 частках.
Пач. у 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадз.

СЕНЬНЯ, 2 красавіка, у 7 гадз. вечі.
праўленьне т-ва „Прыятэльнікі дзяцей"
(Савецкая, 40) скліча актыў ячэек т-ва
— па пытаньні правядзеньня —
месячніка дапамогі дзіцячым дамом.
Фэбконы і мясцовы павінны забясьпечыць акуратную вуку прадстаўнікоў ячэек.
ПРАЎЛЕНЬНЕ.

ТОЛЬКІ ДВА ДНІ
КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА"
Субота. 4 і нядзеля 5 красавіка
ДЗЕННЫЯ СЕАНСЫ
дзьве кардыны ў адзін сэанс
1. Заменены фільм
БУРА Ў КАЛІФОРНІІ
(1000 кінскіх сіл)
2. Гарольд Лойд у лепшай камедыі
ДОКТАР ДЖЭК
Зьвыш праграмы артыст ЭДЗІ БАРТОН.
Сьветавыя цені
Пачатак у 1 гадз. і 2 гадз. 20 м.
Каса з 11 гадз.
НОВЫЯ АТРАКЦЫЁН
ПЕРШЫ РАЗ У БССР
ЦЭНЫ АГУЛЬНАДАСТУПНЫЯ.

АДКРЫГ ПРЫЁМ ЗАЯЎ
на абучэньне ў дзяленьне
школы дарослых Галоўдартрансу БССР
У гор. БАБРУЙСКУ.
У школу прымаюцца асобы абодвых родаў ад 16 да 19 год—дзеці рабочых, батрацкіх, батраковых, бедняцкіх, сярэдняцкіх, служачых і кустарнічкаў з адукацыяй ня ніжэй 4-г дні.
Прыём заяў працягнецца да 15-га красавіка. Заявы прымаюцца ў гор. Бабруйску, пог. Мінскай і Кастрычніцкай вул., у кінаўтарыі школы дзьбудаўчу.
Да заяў прыкладаюцца наступныя дакументы: 1) аб сацыяльным становішчы, 2) аб адукацыі, 3) аб узросце, 4) аб фізычным стане, 5) аб яраце гонку.
Курсанты атрымліваюць стыпэндыю і інтэрнат.
Скончыўшыя курсы скарыстоўваюцца на працах Галоўдартрансу па шляховым будаўніцтве на вакзай брыгадзірыў на сцяжэй спэцыяльнасьці і могуць быць накіраваны ў вышэйшыя навучальныя установы па гэтай лінія кваліфікацыі.
На працягу вучобы стыпэндыя-зарплата павялічваецца ў залежнасьці ад пасьпяховасьці вучня.
Адміністрацыя школы.

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ АПАРАТУ
кіраўніцтва ашчадных і дэпазытных касаў БССР
і ашчадных кас гор. Менску даводзіць да ведама ўсіх працоўных, што з
2-га красавіка пачынаецца
персанальная чыстка супрацоўнікаў.
Першае пасяджэньне адбудзецца ў памяшканьні Наркамфіну (Савецкая, 45) у 7 гадзін вечара.
Просьба да ўсіх укладчыкаў прыйсьці актыўны ўдзел у працы.
Камісія.

3-га красавіка ў 7 гадзін вечара ў памяшканьні клюбу „ЭЛЬВОЦ" (Савецкая, 10)
АДБУДЗЕЦЦА
АДКРЫТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ
апарату НКРаботы, Галоўсацстраху, інстытуту аховы працы, «Установа».
Персанальную праверку праводзіць дырэктар інстытуту аховы працы тав. Дзіхцар Саламон Раміміч.
Запрашаюцца рабочыя, інжынэры, навуковыя працаўнікі БДУ, БАН і навукова-дасьледчых інстытутаў, студэнты, работнікі праверанных у таварыш, члены камісій аховы працы пры ФЗМК і інш.
Камісія НК РСІ БССР.

ЗГУБЛЕНА
пячатка камсамольскай ячэйкі швэйнікаў комінтэрну ЛКСМБ Менсамрэмсаюзу. Лічыць недапрадуманай.

ПРАДАЕЦЦА
піяніно отсл.
Вул. Кравотка на д. № 26, кв. 1, Гусева.

Знойдзены грошы
Зьвярнуцца ў кантору выд-ва „Зьвязда"

Путчынскі с-савет, Копданьскага р-ну
ВЫКЛІКАЕ
гр. гр. Багрыма Вінцэся Антоновіча і Багрыма Ямілію Францаву на 4 красавіка г. г. па справе сваяцтва шлюбу.

БЮРО заочнага навучаньня сэктару прамнадраў ВСНГ БССР
абвяшчае
ПРЫЁМ слухачоў-заочнікаў
у Віцебскі політэхнікум па аддзяленьнях:
электра-тэхнічным, машына-будаўнічым.
Правілы прыёму і анкеты можна атрымаць па ўсіх прадпрыемствах і аб'яднаньнях ВСНГ БССР.
Прыём заяў з 5-га красавіка г. г.
Бюро заочнага навучаньня сэктару прамнадраў ВСНГ БССР.

Даводзім да ведама ўсіх дастаўшчыкаў МЦРК,
што ва ўсіх
дасылаемых рахунках павінна быць абавязкова паказана,
якімі адзінкамі Кандзрабгогу т-вар адпушчан,
напрыклад, крама № 1, ларок № 1, сайгас «Саджаны», сталовая № 1, транспарт, хлебазавод і г. д.
Без паказаньня паўнай адзінкі рахункі банкам аплачвацца ня будуць.
Праўленьне.

БЕЛДЗЯРЖКІНО
патрэбны
старшыя бухгальтары і зканамісты.
Адрас: Савецкая, 90.

ГЛУШЫЦЕЛІ САМАКРЫТЫКІ ПЕРАД ПРАЛЕТАРСКІМ СУДОМ

Справа аб цкаваньні рабкора тав. Раманькова

12-га красавіка вынясная сэсія Вярхоўнага суда БССР будзе слухаць у Магілёве справу аб цкаваньні актыўнага грамадзкага працаўніка, рабкора тав. РАМАНЬКОВА.

Тав. Раманькоў на працягу ўсяго часу працаваў на розных адказных пасадах: з 1922 па 1925 г.—старшынём Мастоцкага сельсавету былога Лупалаўскага раёну; з 1926 па 1929 г.—сакратаром Лупалаўскай райземкамісіі. Тав. Раманькоў заўсёды праводзіў клясававытрыманую лінію ў рабоце, сумленна ажыцьцяўляў мерапрыемствы партыі і савецкай улады. Зьяўляючыся актыўным рабкорам газэт «Беднота», «Камунар Магілеўшчыны», «Зьвязда» і «Праўда», ён вёў рашучую барацьбу з самавольнымі парубкамі лясоў, утойваньнем аб'ектаў абкладаньня, хуліганствам і г. д. Разгортваючы самакрытыку, не зважаючы на асобы, тав. Раманькоў бязьлітасна выкрываў злоўжываньні рэду работнікаў, якія знаходзіліся на адказных пасадах.

Так, ён выкрыў безгаспадарчасьць і нядбайнасьць да сваіх абавязкаў з боку старшыні Лупалаўскага РВК ВАЛЮЖАНІЦА і старшыні Райземкамісіі РАМАНАВА, старшыні Мастоцкага сельсавету МЭХАНІКА ТРАФІМА і яго намесьніка КАРПЯЧЭНКА, упаўнаважанага па лесараспрацоўках ВОЎКАВА ВАСІЛЯ і яго брата БАРЫСА, у якога быў забраны самагончаны апарат, і інш.

У выніку допісаў тав. Раманькова, зьмешчаных у друку, рад гэтых работнікаў быў прыцягнуты да судовай адказнасьці. Валюжаніц быў прыгаворан да грамадзкага ганьбаваньня, Мэханік і Карпячэнка—да пазбаўленьня волі на 1 год і 6 мес., Воўкаў Васіль—да 6 мес. пазбаўленьня волі.

Усе гэтыя «пакрыўджаныя» парашылі ва што-б там ні стала адпомсьціць т. Раманькову. Яны пачалі ўзводзіць на яго рознага роду паклёпы, імкнучыся ўсямерна скампрамэтаваць яго перад мясцовай уладай. Раманаў напісаў заявы пракурору былой Магілеўскай акругі, Магілеўскаму акраддзелу ДПУ, прэзыдыуму РВК і іншым арганізацыям, у якой высунуў цэлы рад зусім неабгрунтаваных, хлусьлівых абвінавачаньняў супроць тав. Раманькова. У гэтай заяве апошні быў прадстаўлены, як клясававораж элемэнт, шкоднік, якога трэба неадкладна ізаляваць ад грамадзкасьці. У якасьці сьведак Раманаў паказаў, зрозумела, на «пакрыўджаных» тав. Раманькова Мэханіка, Карпячэнка і брата Воўкавых.

Адначасова Воўкаў Барыс падаў у Нарсуд 3-га вучастку былой Магілеўскай акругі заяву аб тым, што нібы і перавыбарах Мастоцкага сельсавету, Раманькоў выступіў супроць яго кандыдатуры і назваў яго злачынцам. У якасьці сьведак зноў-такі былі выстаўлены Карпячэнка і Васіль Воўкаў.

Актыўнае цкаваньне тав. Раманькова ўсёй гэтай групай прывяло нават да таго, што ў 1925 годзе ён быў пазбаўлен выбарчых правоў і выведзен са складу Мастоцкага сельсавету. Аднак, акруговая выбарчая камісія ў хуткім часе аднавіла Раманькова ў правах.

Супроць тав. Раманькова была ўзьнята таксама крымінальная справа заможнікам Карыткіным, які ў свой час быў выкрыты Раманьковым, як утойнік аб'ектаў самаабкладаньня і самагоншчык. За гэта Карыткін быў затрыман і асуджаны да пазбаўленьня волі. Вярхсуд БССР, зразумела, спыніў гэту справу, не знайшоўшы ніякіх злачынстваў у дзеяньнях тав. Раманькова.

У сувязі з узбуджэньнем супроць т. Раманькова цэлага раду крымінальных спраў, ён на працягу 14 мес. быў беспрацоўным і каля 5 мес. трымаўся пад вартай. Усе гэтыя агіднасьці спынілі толькі тады, калі на месца выехала спэцыяльная камісія з цэнтру. Белякі і калгасьнікі ў адзін голас заявілі, што Раманькоў зьяўляўся актыўным грамадзкім работнікам, вёў рашучую барацьбу з кулакамі і іх агентамі, у сувязі з чым настроіў супроць сябе цэлы рад асоб.

Глушыцелі самакрытыкі былі канчаткова выкрыты. Выявілася таксама, што заможнікі КАРПЯЧЭНКА І ВОЎКАЎ БАРЫС ПРАЛЕЗЬЛІ Ў МАСТОЦКІ КАЛГАС І ВЯЛІ ТАМ РАБОТУ ПА РАЗВАЛЬВАНЬНІ ЯГО.

Да судовай адказнасьці прыцягнуты 8 асоб. Глушыцелі самакрытыкі, злачынцы і антысавецкі элемэнт атрымаюць па заслугах.

С. Г—н.

Дапаможам распаўсюджваньню лётарэйных білетаў т-ва Чырвонага Крыжу

Выканком саюзу т-ваў Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяца СССР праводзіць у сягучым годзе першую ўсесаюзную лётарэю т-ва. Выпускаецца 20 млн. білетаў на суму 10 млн. руб. (па 50 кап. білет). Лётарэя праводзіцца з мэтай узмацненьня фінансавай базы т-ва для ажыцьцяўленьня вялікіх задач, якія стаяць перад ім у сучасны пэрыяд.

Лётарэйныя білеты падзяляюцца на 8 разрадаў, якія будуць разыграны ў 6 тыражох. Другі тыраж выйграшаў адбудзецца 1 кастрычніка бягучага году ў Менску.

Для БССР выпучан 1 млн. білетаў на суму 500 тыс. руб., якія разьмеркаваны паміж гарадзкімі і раённымі камітэтамі т-ва Чырвонага Крыжу для распаўсюджаньня сярод працоўных. Распаўсюджаньне білетаў пачнецца ў бягучым месяцы.

Паводле пастановы выканкому саюзу т-ваў Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяца СССР 70 проц. ад рэалізаванай сумы застанецца для т-ва Чырвонага Крыжу БССР.

Трэба ўсямерна дапамагчы камітэтам і ячэйкам Чырвонага Крыжу ў распаўсюджаньні лётарэйных білетаў. Гэта ўдарная кампанія павінна быць пасьпяхова праведзена. Заданьне—1 млн. білетаў—павін